Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

МАЙ 5 1933 г. № 97 (4641)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ, ПЕРАДАВЫ—Самая вострая зброя партыі С. Г.—Грамадзкае харчаваньне—на саўгасныя і калгасныя палі (2 стар.).

У КП(б)Б (2 стар.).

Прэзыдэнт АНБ Акад. П. ГОРЫН — На новую ступень (2 стар.).

Акад. Я. КОЛАС—Мабілізаваць масы (2 стар.).

ВІЛЬЛІ МЮНЦЭНБЭРГ—Канцэнтрацыйныя лягеры ў Германіі (2 ст.).

БАЯВЫЯ ТРАДЫЦЫІ «ПРАВДЫ» ЎСЯМУ БАЛЬШАВІЦКАМУ ДРУКУ. (3 стар.).

Спаборніцтва друку БССР і Заходняй вобласьці (3 стар.).

ПЕРШАЕ МАЯ ЗА МЯЖОЙ. (4 стар.).

Ангельскі друк аб першамайскай дэманстрацыі ў Маскве (4 стар.).

У Германіі ўводзіцца абавязковая працоўная павіннасьць (4 стар.).

САМАЯ ВОСТРАЯ ЗБРОЯ ПАРТЫІ

Дзень друку, які адзначаецца штогод 5 мая, зьвязаны з днём выхаду ў сьвет першай легальнай бальшавіцкай штодзённай газэты, цэнтральнага органу нашай партыі «Правды».

«Правда» нарадзілася ў 1912 годзе. Гэта быў пераломны год у расійскім рэвалюцыйным руху. Рэвалюцыйны напор пралетарыяту, яго ўпартая барацьба прымусілі царскі ўрад дазволіць выдаваць рэвалюцыйную рабочую газэту.

«Правда» ў той пэрыяд была мацнейшай зброяй аднаўленьня партыі, мацнейшай зброяй арганізацыі мас, выкрыцьця ліквідатараў, агентаў бур жуазіі ў рабочым руху. Маючы 40-ты сячны штомесячны тыраж, яна была мацнейшым агітатарам і арганізатарам мас вакол сьцягу бальшавізму. Ролю «Правды» ў 1912-14 г. г. можна параўнаць толькі з роляй старой бальшавіцкай «Искры» пры стварэньні партыі ў 1901-1903 г. г. Пры дапамозе «Правды» ў гады ўздыму бальшавікі замацавалі гегемонію ў рабочай клясе.

У ліпені 1914 г., у пэрыяд пачатку сусьветнай імпэрыялістычнай вайны, «Правда» была закрыта. Але царскі ўрад ня змог зьнішчыць рэзультатаў работы бальшавіцкай партыі і яе баявога органу «Правды». Бальшавізм пусьціў глыбокія карэньні ў масы.

5 сакавіка 1917 г. пасьля зьвяржэньня царскага самаўладзтва «Правда» пачала зноў выходзіць. Яна клікала масы на барацьбу супроць вайны, супроць буржуазнага ўраду, яна выкрывала здрадніцкую ролю меншавікоў і эсэраў. У гэты найвялікшы гістарычнай важнасьці пэрыяд «Правда», пад кіраўніцтвам **Леніна і Сталіна**, адыграла выключную ролю ў заваяваньні вялізарнай большасьці рабочай клясы і працоўных мас, у падрыхтоўцы пераможнай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

«Правда», як цэнтральны орган партыі, пасьля Кастрычніцкіх перамог, узбагачоная вялізарнейшым вопытам агітацыі, прапаганды і арганізацыі мас, стала сьцяганосцам бальшавіцкага друку. Акружаная тысячамі бальшавіцкіх газэт, «Правда» стала вялізарнейшай сілай у барацьбе за ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту, за чыстату марксыцка-ленінскага вучэньня, за генэральную лінію партыі, за будаўніцтва сацыялізму.

Бальшавіцкі друк на чале з «Правдой», пад кіраўніцтвам партыі, выгадаваў і выхаваў вялізарнейшую армію рабселькораў, якіх у сучасны момант налічваецца ў СССР больш 3 млн. Гэта армія адыграла і адыгрывае вялікую ролю, зьяўляючыся актыўным памочнікам партыі ў будаўніцтве сацыялізму. Сіла нашага друку заключаецца ў тым, што ён акружан рабселькораўскім актывам, акружан шырокімі масамі, якія зьяўляюцца ня толькі чытачамі, але і творцамі друку. На XII зьезьдзе партыі тав. **Сталін**, гаворачы аб друку, адзначыў: «Друк адзіная зброя, пры дапамозе якой партыя штодзенна, штогадзінна гаворыць з рабочай клясай на сваёй натрэбнай ёй мове. Іншых сродкаў працягнуць духоўныя ніці паміж партыяй і клясай, іншага такога гібкага апарату ў прыродзе няма».

За пэрыяд першай пяцігодкі бальшавіцкі друк вырас і колькасна і якасна. Няма такога кутка ў Савецкім саюзе, дзе-б не выдавалася газэта—друкаваная або насьценная.

«Правда» адыграла вялізарнейшую ролю ў выхаваньні кадраў і ва ўзьвяцьці ідэйнага ўзроўню гэтага выраснага друку. Пад кіраўніцтвам партыі, пры дапамозе «Правды» наш бальшавіцкі друк выкрываў і выкрывае апартуністаў унутры партыі, мабілізуе масы і выхоўвае ў іх рэвалюцыйную пільнасьць. У разгроме ультра-рэвалюцыйнага трацкізму, у разгроме правых апартуністаў—агентаў аджываючых капіталістычных элемэнтаў унутры краіны, «Правда» і ўвесь бальшавіцкі друк адыграл буйнейшую ролю.

У 1923 годзе тав. Сталін указаў, што «пры ўсім значэньні агітацыйнай ролі друку арганізуючая яго роля зьяўляецца ў цяперашні час найбольш «животрепещущим» момантам у нашай будаўнічай рабоце». Гэта ўказань не правадыра партыі знайшло сваё яркае выяўленьне за пэрыяд першай пяцігодкі. Усім вядома роля друку ў арганізацыі сацыспаборніцтва, у разгортваньні самакрытыкі—гэтых двух мацнейшых вагароў, рухаючых мільённыя масы.

За пэрыяд першай пяцігодкі наш друк перабудаваўся. Партыя «пераўзброіла друк»—сказаў тав. Сталін на XVI зьезьдзе партыі. Гэта пераўзбраеньне заключалася ў тым, што друк «з органу пераважнага паведамленьня палітычных навін дня» ператварыўся «ў сур'ёзны орган экапаміч нага выхаваньня мас насельніцтва» (Ленін).

Мы ўступілі ў другую пяцігодку. Роля друку ў вырашэньні гістарычных задач другой пяцігодкі вялізарная. Аднэй з рашаючых задач, ускладзеных на друк, зьяўляецца сацыялістычнае перавыхаваньне рабочых і калгасьнікаў з мэтай ліквідацыі ў іх сьвядомасьці рэштак капіталізму. Друк, вучачыся ад баявога органу партыі «Правды», павінен умець увязваць барацьбу за канкрэтныя практычныя задачы, за штодзенныя запатрабаваньні шырокіх мас з барацьбой за генэральную лінію партыі, за канчатковыя мэты нашай барацьбы. Штодзен на пытаньнях апэрацыйнай работы фабрык, заводаў, калгасаў, саўгасаў друк павінен выхоўваць рабочых і калгасьнікаў, як сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Асабліва вялізарная роля друку ў правядзеньні першай вясны другой пяцігодкі. Друк павінен мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на пасьпяховае выраш ваньне задач пасеўпай. Начэснае месца ў штодзённай рабоце партыйных арганізацый, палітаддзелаў МТС і раённых газэт павінна заняць арганізацыя насьценных, палявых і брыгадных штодзенак, устанаўленьне пастоў друку ў кожным калгасе, брыгадзе, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на ўмацаваньне апорных і вядучых для сельскага нізавога друку газэт у саўгасах і МТС.

У дзень 5 мая трэба праверыць, наколькі і як друк зьвязан з шырокімі масамі рабочых і калгасьнікаў. Ва ўсёй нашай рабоце партыя ставіць у аснову сувязь з масамі. Наш бальшавіцкі друк робіцца рукамі мільённых мас перадавых рабочых і калгасьнікаў. Адсюль грош цана будзе тэй газэце, якая страціць сувязь з гэтымі масамі. Трымаць з масамі цесную сувязь—гэта значыць выхоўваць іх, вучыць іх барацьбе з клясава-варожымі сіламі, прыслухоўвацца да голасу мас, арганізуючы іх для далейшай пераможнай барацьбы.

Наша бальшавіцкая «Правда» заўсёды працавала разам з масамі, узначальвала гэтыя масы. У гэтым яе сіла. Друк павінен вывучаць багацейшы вопыт «Правды», вучыцца ў яе рэвалюцыйнай пільнасьці, бальшавіцкай непрымірымасьці з малейшымі адхіленьнямі ад лініі партыі, ідэйнай прынцыповасьці ў пастаноўцы пытаньняў.

У дзень друку партыйныя арганізацыі павінны праверыць, наколькі і як яны ажыцьцяўляюць кіраўніцтва друкам і рабселькорамі. А ў нас, у Беларусі, з гэтым кіраўніцтвам ня ўсюды яшчэ ўсё добра. ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб мерапрыемствах у сувязі з перадавым артыкулам «Правды» канстатаваў значнае аслабленьне за апошнія месяцы ўвагі з боку раду цэнтральных і раённых газэт, раённых партыйных арганізацый і асабліва партыйных ячэек па пытаньнях рабселькораўскага руху і нізавога друку. ЦК КП(б)Б намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па стварэньні неадкладнага пералому ў партыйным кіраўніцтве нізавым друкам і рабселькорамі. Гэта пастанова ЦК павінна знайсьці найхутчэйшае праламленьне ў рабоце партыйных арганізацый.

Друк вырас, ускладніліся яго задачы. Партыйнага кіраўніцтва—пастаяннага, штодзённага, канкрэтнага і дзейснага патрабуе цяпер друк, як ніколі.

Пад кіраўніцтвам партыі наш друк стане яшчэ больш адточным, стане яшчэ больш вострай зброяй у барацьбе з клясавымі ворагамі, у барацьбе за сацыялізм.

Месячнік друку ў БССР

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 4-V-33 г.

1. Сьвяткаваньне дня друку па БССР перанесьці на 20 мая, абвясьціўшы з гэтага дня ўсебеларускі месячнік друку.

2. Для кіраўніцтва правядзеньнем дня друку і месячніка друку вылучыць камісію пад старшынствам т. ЛЯЎКОВА ў складзе т. т. БРАГІНСКАГА, ЦІКА, ХЭЙФЭЦА, ШАСТАКОВА і ЎСТАЛАГА.

3. Абавязаць усе цэнтральныя і раённыя газэты шырока адзначыць на сваіх старонках 5 мая 21 гадавіну існаваньня газэты «Правда».

4. 20 мая газэтам БССР прысьвяціць асноўны зьмест нумароў дню друку па БССР.

5. Абавязаць усе цэнтральныя газэты БССР на час месячніка друку сыстэматычна зьмяшчаць на старонках газэты адзелы аб месячніку друку, а таксама выпучыць спэцыяльных работнікаў па месячніку друку, вызваліўшы іх на гэты час ад усёй іншай работы па рэдакцыі.

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

Сяўба разгортваецца марудныміі тэмпамі

АСАБЛІВА АДСТАЮЦЬ ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ, УВАРАВІЦКІ, ЦЕРАХАЎСКІ, БАБРУЙСКІ, ШКЛОЎСКІ, КРЫЧАЎСКІ, БЫХАЎСКІ і МАГІЛЕЎСКІ РАЁНЫ

Удзесяцярыць тэмпы, захаваўшы высокую якасьць палявых работ

ЗАСЕЯНА 228,805 га ЯРАВОГА КЛІНУ

20 КРАСАВІКА 1933 г.	25 КРАСАВІКА 1933 г.	1 МАЯ 1933 г.	1 МАЯ 1932 г.
27.690	84.692	228.805	34.500

ЗВОДКА НКЗ БССР НА 1-га МАЯ

РАЁНЫ	Засеяна ў проц. да пляну	У тым ліку Саўгасы	Калгасы	Аднаасобнікі
ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА:				
Асьвейскі	0,8	—	125	—
Аршанскі	0,4	—	244	—
Бешанковіцкі	2,7	33	1011	112
Віцебскі	2,6	122	798	22
Вушацкі	2,5	—	742	16
Гарадоцкі	0,2	—	125	—
Дубровенскі	0,3	1	101	—
Дрысенскі	2,3	10	757	13
Лёзьнянскі	0,7	—	352	—
Лепельскі	9,9	26	3737	106
Полацкі	6,9	104	2923	250
Расонскі	3,9	—	831	163
Сураскі	0,7	22	122	63
Сеньненскі	5,2	45	2057	10
Сіроцінскі	0,2	—	88	2
Чашніцкі	6,4	12	1634	22
Усяго па зоне	2,8	395	15649	790
ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА:				
Асінавіцкі	9,0	—	1246	657
Быхаўскі	0,9	—	307	157
Барысаўскі	12,7	343	2365	2059
Бялыніцкі	9,8	—	2250	945
Бягомльскі	11,9	17	1995	204
Бярэзінскі	6,0	32	1491	592
Горацкі	2,3	58	724	470
Заслаўскі	11,0	87	2201	177
Клімавіцкі	8,4	62	3626	126
Крупскі	4,1	44	1123	169
Капыльскі	22,8	426	6353	846
Касьцюковіцкі	8,8	140	4733	293
Клічаўскі	6,2	110	907	727
Дзяржынскі	10,7	79	3506	160
Крычаўскі	0,5	—	123	—
Лагойскі	5,0	—	1010	206
Магілеўскі	2,1	57	953	252
Мсьціслаўскі	7,0	20	288	22
Менскі	15,4	840	6213	583
Прапойскі	2,7	18	701	48
Пухавіцкі	4,0	169	1106	707
Смалявіцкі	5,2	212	1027	406
Талачынскі	1,0	35	410	43
Чэрвеньскі	6,2	299	930	602
Чавускі	3,2	—	1279	499
Чэрыкаўскі	6,3	1	1733	130
Шклоўскі	0,9	—	486	36
Вузьдзенскі	15,6	53	2990	416
Плешчаніцкі	8,4	24	1605	219
Усяго па зоне	6,3	3126	54181	11781
ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА:				
Брагінскі	18,4	3	2568	958
Буда-Кашалёўскі	15,4	143	2470	680
Бабруйскі	2,1	—	655	510
Веткаўскі	10,6	283	1994	1448
Глускі	17,1	543	3939	1867
Гомельскі	18,2	879	2338	1156
Жыткавіцкі	27,8	212	1956	938
Кармянскі	7,1	12	1357	1013
Камарынскі	13,7	—	1135	370
Жлобінскі	7,8	13	1558	1572
Ельскі	18,7	150	2383	834
Лоеўскі	17,0	37	2845	783
Любаньскі	21,2	169	2551	1456
Лельчыцкі	28,5	109	1564	2431
Мазырскі	21,2	675	5351	2456
Нараўлянскі	16,4	—	1645	1413
Парыцкі	34,4	129	4749	6741
Пятрыкоўскі	22,6	350	2381	4192
Рагачоўскі	15,6	319	3382	3198
Рэчыцкі	23,1	536	4146	3818
Слуцкі	41,2	99	12036	3588
Старобінскі	34,3	111	3853	3783
Стара-Дароскі	16,2	—	1461	2024
Тураўскі	39,7	53	1765	1637
Церахаўскі	6,6	42	1894	397
Чачэрскі	24,2	157	3052	1884
Чырв.-Слабодзкі	30,4	178	2870	1751
Чырвонапольскі	0,9	3	239	53
Уваравіцкі	6,5	445	1217	292
Хойніцкі	20,8	605	2880	1133
Усяго па зоне:	17,6	6255	82252	54376
Па БССР	9,1	9776	152082	66947
Было на 25-IV-33 г.	3,4	3445	58772	22475

ПЛЯН СЯЎБЫ АЎСА ВЫКАНАН УСЯГО ТОЛЬКІ НА 21,3 проц.

ПАКОНЧЫЦЬ З ГАНЕБНЫМ АДСТАВАНЬНЕМ, НЕАДКЛАДНА і ПОУНАСЬЦЮ ЗАСЕЯЦЬ АВЁС

20 КРАСАВІКА	25 КРАСАВІКА	1 МАЯ
12.129	27.299	106.739
2,4 ПРОЦ. ПЛЯНУ	5,4 ПРОЦ. ПЛЯНУ	21,3 ПРОЦ. ПЛЯНУ

ЗВОДКА НКЗ БССР АБ ХОДЗЕ СЯЎБЫ АЎСА НА 1 МАЯ

Назва раёнаў	План	Засеяна	Проц.
ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА:			
Асьвейскі	3.000	—	—
Аршанскі	18.000	89	0,5
Бешанковіцкі	7.000	554	7,9
Віцебскі	6.000	465	7.8
Вушацкі	4.000	273	6,8
Гарадоцкі	11.000	55	0,5
Дубровенскі	7.000	32	0,5
Дрысенскі	6.000	585	9,8
Лёзьнянскі	9.000	84	0,9
Лепельскі	6.000	2.570	42,8
Полацкі	8.000	2.880	36,0
Расонскі	4.000	757	18,9
Сураскі	4.000	103	2,6
Сеньненскі	7.000	1.663	23,8
Сіроцінскі	5.000	80	1,6
Чашніцкі	3.500	1.361	38,9
УСЯГО	108.500	11.479	10,6
ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА:			
Асінавіцкі	4.500	541	12,0
Быхаўскі	13.000	110	0,8
Барысаўскі	10.000	2.910	29,1
Бялыніцкі	7.000	476	6,8
Бягомльскі	3.000	965	32,2
Бярэзінскі	8.000	604	7,6
Горацкі	13.000	293	2,3
Заслаўскі	6.000	1.477	24,6
Клімавіцкі	8.000	1.880	23,5
Крупскі	8.000	549	6,9
Капыльскі	8.000	4.338	60,5
Касьцюковіцкі	10.000	1.977	19,8
Клічаўскі	6.000	50	0,8
Дзяржынскі	8.000	1.793	22,4
Крычаўскі	3.800	15	0,4
Лагойскі	6.000	802	13,4
Магілеўскі	16.000	328	2,1
Мсьціслаўскі	8.000	108	1,4
Менскі	11.000	6.478	58,9
Прапойскі	3.900	82	2,1
Пухавіцкі	10.000	835	8,4
Смалявіцкі	9.000	1.185	13,2
Талачынскі	12.000	206	1,7
Чэрвеньскі	7.000	390	5,6
Чавускі	14.000	189	1,4
Чэрыкаўскі	3.000	314	10,5
Шклоўскі	13.000	237	1,8
Вузьдзенскі	4.500	893	19,8
Плешчаніцкі	4.000	275	6,9
УСЯГО	237.700	30.800	13,0
ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА:			
Брагінскі	3.200	1.412	44,1
Б.-Кашалёўскі	4.800	1.945	40,5
Бабруйскі	12.000	732	6,1
Веткаўскі	6.300	1.706	27,1
Глускі	8.400	3.181	37,9
Гомельскі	4.400	1.445	32,8
Жыткавіцкі	2.400	1.376	57,3
Кармянскі	720	460	6,4
Камарынскі	1.250	600	48,0
Жлобінскі	6.000	2.176	36,3
Ельскі	3.300	1.988	60,2
Лоеўскі	3.300	1.574	47,7
Любаньскі	4.300	2.007	46,7
Лельчыцкі	1.700	1.405	82,6
Мазырскі	6.000	3.725	6,1
Нараўлянскі	3.100	1.377	44,4
Парыцкі	5.500	3.835	69,7
Пятрыкоўскі	4.600	2.420	52,6
Рагачоўскі	9.500	2.958	31,1
Рэчыцкі	6.400	3.173	49,6
Слуцкі	11.000	9.185	83,5
Старобінскі	6.100	4.190	68,7
Ст.-Дароскі	4.200	1.459	34,7
Тураўскі	2.000	1.474	73,7
Церахаўскі	6.500	670	10,3
Чачэрскі	4.000	2.493	62,3
Чырвона-Слабодзкі	4.000	2.483	62,1
Чырвонапольскі	4.700	64	1,4
Уваравіцкі	5.500	790	14,4
Хойніцкі	4.000	2.157	53,9
УСЯГО	155.350	64.460	41,5
Па БССР	501.550	106.739	21,3

І ЯКАСЬЦЬ, І ТЭМПЫ

ЯК ПРАЦУЕ БРЫГАДА РАКОЎСКАГА

ВОРША. (Наш кар.).

Пры 12 конях палявочая брыгада тав. Ракоўскага калгасу «Чырвоны бераг» павінна засеяць звыш 60 гэктараў яравога кліну.

Яшчэ ў сакавіку, абгаварыўшы свой вытворчы плян, брыгада выклікала на спаборніцтва па правядзеньні веснавой сяўбы агароднюю брыгаду, узяўшы на сябе абавязацельства: «... засеяць збожжавыя культуры за 8 дзён, а прапашныя за 9, поўнасьцю выканаць плян радковай сяўбы і ўгнаеньня, забясьпечыць ураджай: па аўсу — 10 цэнтн. з га, па ячмені — 12 цэнтн. і па бульбе — 130 цэнтн. з га».

Ужо сёньня можна сказаць, што брыгада Ракоўскага ня толькі запісала ў сваім дагаворы гэта абавязацельства, але і па-бальшавіцку змагаецца за яго выкананьне.

Як толькі з поля сышоў сьнег і коням можна было ўзьбіцьці на раллю, брыгада вышла ў поле. Першыя два тыдні работы паказалі, што ўзятыя брыгадай на сябе абавязкі будуць выкананы поўнасьцю. З дня ў дзень выконваецца і нават перавыконваецца норма выпрацоўкі па ворыве (0,6 га), якасьць работы добрая. Да 1 мая брыгада поўнасьцю падрыхтавала глебу пад засеў культур першай чаргі, засеяла 8 га вікі, вывезла на 15 га гною, расьсеяла на 16 га штучныя ўгнаеньні.

Што-ж забясьпечвае брыгадзе тэмпы і якасьць яе работы?

Перш за ўсё добрая арганізацыя працы. Брыгада мае ня толькі вытворчае заданьне, але і дэтальны плян затраты людзкой і цягавай сілы на кожны вытворчы працэс. Так, калі ў вытворчым заданьні ёсьць паказальнікі наогул па засеву аўса, дык ў дэтальным пляне брыгады Ракоўскага ёсьць гэтыя-ж паказальнікі (плошча, патрэбнасьць рабочых, коняй, машын, норма выпрацоўкі і ацэнка ў працаднёх) па баранаваньні, ворыве, дыскаваньні, расьсеве штучных угнаеньняў, сяўбе, спружынаваньні і г. д.

У мэтах большай анэрацыйнасьці ў расстаноўцы сіл брыгада разьбіта на зьвеньні: сейбітаў, баранавалокаў, аратых і г. д.

Кожны дзень з 6 да 9 гадзін увечары Ракоўскі правярае рэзультаты працы кожнага зьвяна, улічвае выпрацоўку кожнага калгасьніка. Гэты пэрсанальны ўлік не праводзіцца фармальна. Калі было заўважана, што калгасьнікі Войт Т. і Пустыньнікаў Д. нядобраякасна выканалі заданьні па ворыве, ім за гэту работу была зьніжана норма аплаты ў працаднёх на 5 проц. А ў гэты-ж час Сабіну, Кандраценку і Хаецкаму за добраякасную работу была зроблена адпаведная надбаўка.

Добрая якасьць работы ў брыгадзе Ракоўскага забясьпечваецца ня толькі зьніжэньнем, або надбаўкамі на працадні. Як брыгадзір, так і парторг брыгады тав. Нікандраў аддаюць нямала ўвагі разгортваньню сярод калгасьнікаў масава-растлумачальнай работы. Кожны выпадак з вытворчага жыцьця брыгады шырока абгаворваецца на дзесяціхвілінных нарадах перад выхадам на работу, або ў часе абедзенага перапынку. Пры брыгадзе арганізован ленінскі куток, для якога, улічваючы тое, што сярод калгасьнікаў ёсьць беларусы, яўрэі і палякі, выпісваюцца газэты на трох мовах.

Вольныя хвіліны ад работы тав. Нікандраў скарыстоўвае для правядзеньня чытак газэт, абгаварэньня надзенных палітычных пытаньняў. Прычым кожная гутарка, кожная чытка газэт парторгам улічваецца ў спэцыяльным дзеньніку, у якім можна бачыць, што брыгадай распрацоўваліся матар'ялы зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, важнейшыя пастановы партыі і ўраду аб веснавой сяўбе і г. д.

Добра пастаўленая масавая работа забясьпечыла сьвядомыя адносіны да працы калгасьнікаў.

Працуючы ў полі, ніхто з брыгадзе не забывае аб закончаным ворыве з «агароднікамі». Ня гледзячы на тое, што 2—3 разы ў месяц праўленьне калгасу праводзіць спэцыяльныя вытворчыя нарады па ўзаемнай праверцы паміжбрыгаднага спаборніцтва, калгасьнікі палявочай брыгады і асабліва яе брыгадзір амаль кожны дзень забягаюць у праўленьне да рахункавода і правяраюць у яго работу агародняй брыгады:

— Сацдагавор-жа мы недарма пісалі. Кожны пункт павінен быць выкананы.

Так кажуць калгасьнікі. Яны — гаспадары свайго слова. Невыпадкова-ж вылучаны ў брыгадзе бракоўшчыкам адзін з лепшых ударнікаў — тав. Собін «скардзіцца»:

— Мая нагрузка, як відаць, непатрэбная. Няма чаго бракаваць...

Віт. ДАЛЬ.

ЗАСЕЯНЫМІ ГЭКТАРАМІ

перадавыя калгасы адзначылі першае мая

Буда-Кашалёва

КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ», РАГІНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, СУСТРЭЎ ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ САЛІДАРНАСЬЦІ СКАНЧЭНЬНЕМ СЯЎБЫ ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР. КАЛГАС ЗАСЕЯЎ 30 ГА АЎСА (ПЛЯН 20 ГА), 10 ГА ЯЧМЕНЮ, 9 ГА ВІКІ, 8 ГА ІЛЬНУ. ЗАРАЗ КАЛГАС ПЕРАКЛЮЧЫЎСЯ НА ПАСАДКУ БУЛЬБЫ. УЖО ПАСАДЖАНА ДВА ГА.

Камарын

КАЛГАС «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ» ЗАКОНЧЫЎ СЯЎБУ РАНЬНІХ ЯРАВЫХ. ЗАСЕЯНА 29 ГА АЎСА, 19 ГА ЯЧМЕНЮ І 12 ГА ПШАНІЦЫ. З ПЕРШАГА МАЯ КАЛГАС ПАЧАЎ СЯЎБУ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР. ЗА ДЗЕНЬ ПАСАДЖАНА 10 ГА БУЛЬБЫ.

БРЫГАДНЫЯ ДНІ

Учора мы паказалі ў „Зьвязьдзе" вопыт шэфработы парт'ячэйкі ЦК КП(б)Б, якая дабілася, што яе падшэфны калгас „Кастрычніцкая рэвалюцыя" (Менскі раён) у тэрмін, з перавыкананьнем пляну скончыў сяўбу аўса.

У карэспандэнцыі „Брыгадныя дні" паказваецца адна з брыгад гэтага калгасу, а таксама тая дапамога, якую аказалі брыгадзе і ўсяму калгасу шэфы.

У праўленьні калгасу пра брыгадзіра брыгады «Банькаўшчына» нам гаворыць так:

— Калганкін дае выпэйшыя нормы выпрацоўкі па ворыве, лепшы ударнік. Хто ён, **КАЛГАНКІН**? У мінулым — батрак. Потым добраахвотнік Чырвонай арміі. У 1929 годзе адзін з першых арганізатараў калгасу «Кастрычніцкая рэвалюцыя». Калгасьнік, актывіст, агітатар і арганізатар калгаснай справы.

Ідзем у яго брыгаду. Брыгада тав. Калганкіна павінна засеяць 102 га, у тым ліку: аўса 37 га, вікі з аўсом—15 га, бульбы—35 га, турнэпсу—4 га, бручкі—5 га і ячменю—5 га.

Засеяць у тэрмін авёс—першае выпрабаваньне і брыгадзіра і ўсёй яго брыгады.

Сёньня (24 красавіка) брыгада павінна засеяць і забаранаваць у 8 сьлядоў 6 га аўса.

Яшчэ да сьвітаньня мы на нагах. Ідзем на стайню.

А палове шостай ужо другі званок для выхаду калгасьнікаў на працу. Збор—15 хвілін. За 15 хвілін калгасьнік павінен падрыхтаваць каня і інвэнтар і выехаць у поле.

Прыклад сапраўдная дысцыпліны паказваюць калгасьнікі **ЖЫВІЦА СТАСЬ, КУХАРСКІ** і іншыя. Яны заўсёды першымі выходзяць у поле. Яшчэ брыгада была на стайні, а Жывіца і яшчэ 5 калгасьнікаў ужо выехалі на поле і прыступілі да баранаваньня.

Збор працоў арганізавана. Праз 15 хвілін уся брыгада была ўжо ў полі.

Сілы былі расстаўлены так: 10 пар коняй шакіравалі на баранаваньне. Адзін параконны плуг вылучылі на сканчэньне ворыва. З калгасьнікі вызначаны сейбітамі. Кожны калгасьнік дакладна ведае сваю норму. Ворыва, баранаваньне і сяўба разгарнуліся.

У перапынак праводзім кароценькую гутарку. Калгасьнікі адразу бяруць пад жорсткі абстрэл тых, хто ўчора спазьніўся на работу. Не даруюць нават і тым, хто спазьніўся ўсяго на некалькі хвілін. Такіх у брыгадзе—2-3. Гэта Казырскі Браніслаў, Кураневіч Адась.

Цікавімся работай лепшых калгасьнікаў.

— **ЖЫВІЦА СТАСЬ** у нас перадавік,—гаворыць брыгадзір т. Калганкін,—на такіх ударнікаў, як Жывіца Стась, Кухарскі і іншыя, мы апіраемся ва ўсёй нашай рабоце на полі. На Куракевічаў Адася і Пятра не абапрэшся: яны горш працуюць і сыстэматычна спазьняюцца.

Хоць коні ў часе перапынку і былі падкормлены, тым ня менш галоўны баранавальшчык раптам заявіў, што яго коні «прысталі ля ніва».

І сапраўды: коні ня рушылі з месца. Узяўся сам брыгадзір. Але і брыгадзіра коні ня слухаліся. Аказваецца гэта пара коняй—самая горшая ў калгасе і яшчэ ні разу ў галаве калёны не хадзіла. Да таго-ж за 3 гадзіны працы на цьвёрдым грунце коні запада прысталі.

Некаторыя калгасьнікі адразу зганьбавалі нагаяльшчыка коняй—баранавальшчыка камсамольца тав. Маршчонка Міхася.

— Ну, які там з цябе працаўнік — зьдзекваліся над ім. А яшчэ галоўны, нашоў напярэдзе, эх!..

Варта толькі было пусьціць першымі другую пару лепшых коняй і коні, прымацаваныя да Маршчонка Міхася, самі рушылі сьледам за галоўнай парай.

Або ўзяць такі факт. У брыгаду на палявыя работы дапушчаны падросткі. Так, да ворыва быў дапушчан Маршчонак Мікола, хлопчык 14 год і інш. Зусім зразумела, што яны не маглі добра араць. Брыгадзір рашуча патрэбаваў супроць гэтых фактаў, але... нічога не дапамагло. Калганкіна прымусілі згадзіцца.

Гэта клясавы вораг таксама скарыстаў для цкаваньня і кампраметацыі брыгадзіра. На праўленьні калгасу тав. Калганкіну—лепшаму брыгадзіру калгасу—потым пагражалі аддачай пад суд, зьняцьцем з работы. Гэтыя кулацкія махінацыі свячасова таксама ня былі выкрыты.

Шэфская брыгада дапамагла калгасу выкрыць кулацкія манэўры і стварыць умовы для работы калгасных брыгадзіраў. З 24 красавіка быў абвешчан штурм пад лёзунгам—неадкладна завяршыць сяўбу аўса. Гэты дзень—24 красавіка—быў абвешчан днём штурму за стопроцантае выкананьне пляну.

Атрымаўшы баявое заданьне 24 красавіка ў канцы дня (ужо сьцямнела) пасьля палявых работ, мы з брыгадзірам Калганкіным і актывам праводзім вытворчую нараду: падагулілі вынікі дзеннай работы з ацэнкай работы кожнага паасобнага калгасьніка, растлумачылі задачы заўтрашняга дня і ўмовіліся, што ў гэты дзень (25 красавіка) выходзім у поле на паўгадзіны раней (у 5 гадзін 30 хвілін) звычайнага тэрміну. Калгасьнікі адпадушна згадзіліся.

Сёньня—25-га—апошні дзень сяўбы аўса. Калганкін а 4-й гадзіне раніцы ўжо на нагах.

І сёньня, як і заўсёды, лепшыя калгасьнікі на стайню прышлі першымі, чакаючы пакуль коні будуць накормлены. А 5 гадзіне ўся брыгада—у поўным зборы. Ужо час быў запрагаць коняй. Аднак, вышла досыць вялікая «асечка»: коні яшчэ не поены. Для таго, каб напаіць коняй,

У КП(б)Б

ГОМЕЛЬ

Партарганізацыя заводу імя тав. ЛАНЦУЦКАГА атрымала буйнейшую перамогу ў барацьбе за транфінплян—ЗАВОДАМ ЗАВАЯВАН ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ ЦК КП(б)Б. За 1932 год вытворчая праграма выканана на 113 проц., прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 24 проц. (плянам прадугледжана 22 проц.), зьніжан сабекошт на 9,1 проц., брак зьніжан на 2 проц. супроць пляну.

Такія лічбы дасягнуты дзякуючы таму, што партыйна-масавая работа на заводзе сапраўды падпарадкавана задачам выкананьня транфінпляну, шырока разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, камуністы ў брыгадах узначальваюць ударную работу.

* * *

ГОМЕЛЬСКІ ГК КП(б)Б пастанавіў па прыкладзе Менску і Віцебску правесьці АГЛЯД-КОНКУРС СЕТКІ ПАРТАСЬВЕТЫ. У аснову ўмоў агляду-конкурсу ўзяты такія пункты: 100 проц. ахопу партарганізацыі вучобай, 100 проц. наведваньня, якасная і колькасная прапрацоўка і засваеньне тэм, увязка тэарэтычнай прапрацоўкі з практычнай работай па сацбудаўніцтву. Гомельскі ГК выклікаў на сацспаборніцтва МЕНСК і ВІЦЕБСК. Для кіраўніцтва аглядам - конкурсам створан штаб.

МЕНСК

МЕНСКІ ГК КП(б)Б абгаварыў СТАНОВІШЧА ПАРТВУЧОБЫ ў парткалектыцах Белдэзаркбуду, Менбуду і Дому Ураду і прызнаў яго незадавальняючым.

Сакратарыят гаркому пастанавіў: за фармальны падыход і апартуністычныя адносіны да пастановы партасьветы сакратара парткалектыву Белдэзаркбуду тав. Вайнэра ПАПЯРЭДЗІЦЬ. Прыняць да ведама, што сакратар ячэйкі КП(б)Б пабудовы Дому Ураду тав. Худыш З РАБОТЫ ЗЬНЯТ. УКАЗАЦЬ сакратару парткалектыву Менбуду тав. Фішу на адсутнасьць сыстэматычнага кіраўніцтва работай партшкол.

Гарком прапанаваў парткалектывам Менбуду, Белдэзаркбуду і парт'ячэйцы пабудовы Дому Ураду ў дэкадны тэрмін дабіцца 100 проц. ахопу партвучобай кандыдатаў і моладых членаў партыі і забясьпечыць нармальную работу школ.

ВІЦЕБСК

Па водпе пастановы Віцебскага гаркому КП(б)Б 15 мая будзе праведзен адзіны партдзень у прамысловых ячэйках па пытаньні: «БАРАЦЬБА ЗА ЯКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ ПРАМФІНПЛЯНУ». Падрыхтоўка да партдня праводзіцца пад знакам стварэньня рашучага пералому ў ходзе выкананьня прамфінпляну па якасных паказальніках, пад вялікім узмацненьнем парткіраўніцтва вытворчасьцю, узьняцьця арганізаванай ролі камуністаў і разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочых, ІТР і служачых.

МАГІЛЁЎ

Магілёўскі РК КП(б)Б абгаварыў ход сяўбы ў раёне і за незабясьпечэньне разгортваньня масавай сяўбы ВЫНЕС ВЫМОВЫ СТАРШЫНІ ПАШКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ т. КАМКОВУ і ЎПАЎНАВАЖАНАМУ РК ТАВ. ФАЙНУ, СТАРШЫНІ ВІШЗЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ Т. ЛАБАНАВУ, САКРАТАРУ ПАРТ'ЯЧЭЙКІ ТАВ. КАНДРАЦЬЦЕВУ, ДЫРЭКТАРУ САЎГАСУ «ЗАРА» Т. ЧАРНОВУ І ЎПАЎНАВАЖАНАМУ РК ПА ВЫШАЎСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ ТАВ. ГОЛЬДЗІНУ. Справа аб сакратары машынацыйнай парт'ячэйкі т. Гаварцаву і старшыні Амхаўскага сельсавету т. Донда, якія самавольна выехалі ў горад, перадана ў кантрольную камісію. Гарком адзначыў факты незадавальняючай арганізацыі глебы і правядзеньня сяўбы і катэгарычна прапанаваў парт'ячэйкам, сельсаветам, упаўнаважаным РК і старшыням калгасаў узмацніць кантроль за якасьцю палявых работ.

Усебеларускі конкурс трактарыстаў

Трактарысту—вядучую роль на палёх калгасаў

Больш месяца прайшло з таго часу, як ЦК ЛКСМБ і Наркамзем БССР абвясьцілі ўсебеларускі конкурс спаборніцтва па лепшага трактарыста. За гэты перыяд некаторыя раёны дабіліся вялікіх зрухаў. Дрысенскі райком камсамолу пры актыўнай дапамозе вызнной брыгады газэты «Чырвоная зьмена» з гонарам, па-баявому выконвае ўмовы і паказальнікі конкурсу. Там кожны трактарыст у паасобку ўключыўся ў конкурс, кожны ўзяў на сябе канкрэтныя абавязкі.

— Найлепш, у максымальна-кароткія тэрміны правесьці веснавую сяўбу. Піводнага прастою трактараў. Рацыянальна скарыстоўваць гаручае. Вядучую ролю на палёх веснавой сяўбы калгасаў МТС і саўгасаў — трактарысту!

І гэтыя абавязкі выконваюцца з гонарам, аб гэтым сьведчыць узорная работа камсамольцаў трактарыстаў.

Ня дрэнна працуе па ажыцьцяўленьні ўмоў конкурсу і камсамол **Случчыны.** У кожнай брыгадзе, у кожнай трактарнай калёне прапрацаваны ўмовы конкурсу, намечаны канкрэтныя мерапрыемствы кожным трактарыстам-камсамольцам.

Трактарыст другой брыгады 3 вучастку Слуцкай МТС тав. **Ражанец** выклікаў па сацыялістычнае спаборніцтва трактарыста тав. **Ахраменку Хведара.** Заключаючы паміж сабой дагавор, яны запісалі:

— Будзем змагацца за добраякасную апрацоўку глебы, за выкананьне і перавыкананьне пораў выпрацоўкі, за жаломіо гаручых і змазачных матар'ялаў, за ахову трактара.

У індывідуальнае сацспаборніцтва ўступілі трактарысты **Пракаповіч У., Якімовіч Н., Хавустовіч Я., Крот** і іншыя. Зараз райком камсамолу паведамляе, што гэтыя трактарысты з посьпехам выконваюць узятыя на сябе абавязацельствы, яны першымі ідуць на Случчыне.

Ня дрэнна разгортваюць работу па конкурсе ў **Бабруйску, Магілеве, Пухавічах, Барысаве, Рэчыцы** і г. д. Усё гэта таму, што ў гэтых раёнах конкурсам кіруюць партыйныя арганізацыі. Большасьць ячэек КП(б)Б па справе дапамагаюць камсамолу ў правядзеньні конкурсу.

Але так справа стаіць не ва ўсіх раёнах БССР. З 57 МТС на сёнешні дзень уключыліся ў конкурс толькі 37. Ва многіх раёнах, напрыклад, у **Гомелі, Рагачове, Асьвеі, Расонах, Чашніках, Бешанковічах, Сіроціне, Гарадку, Сянно, Шклове, Мсьціслаўі, Старобіне, Старых Дарогах, Любані, Тураве, Чэрвені і Глуску** камсамол ячэй ня ўключыўся ў конкурс на лепшага трактарыста.

У **Менску,** напрыклад, зусім інакш зроблена. Выбралі штаб... памецілі рад мерапрыемстваў, а трактарысты першай і другой МТС норм ня выконваюць, гаручае перавыдаткоўваецца і г. д. Менскі гарком ЛКСМБ кіруе конкурсам па-канцылярску, без належнай работы ў брыгадах. І гэта ў той час, калі ініцыятарам арганізацыі ўсебеларускага конкурсу была Менская арганізацыя камсамолу.

А як разгортваюць работу па конкурсе цэнтральныя арганізацыі **трактарацэнтры, Наркамсаўгасаў і іншыя.** Кіраўнікі трактарацэнтраў яўна ігнаруюць конкурс, яны не зразумелі тэй ролі, якую прыносіць гэта важнейшае мерапрыемства. Прайшло больш месяца і нічога імі ня зроблена.

Разам з пачаткам конкурсу трактарыстаў Цэнтральным Камітэтам ЛКСМБ быў абвешчан пяцідзеньнік праверкі завозу ў МТС і саўгасы гаручага, захаваньня яго і забясьпечэньня тарай. На гэтым вучастку камсамол БССР дабіўся значна большых посьпехаў. У **Лепелі** сабрана 8 бочак (у тым ліку 45-тонная, якая з 1931 году без карысьці ляжала на чыгуначнай станцыі). У **Талачыне** сабралі 45 бочак (адна пяцітонная). У **Рэчыцы** — 60 бочак і г. д.

Усебеларускі конкурс на лепшага трактарыста павінен набыць масавы характар. На сёнешні дзень па БССР уключыліся індывідуальна звыш тысячы камсамольцаў-трактарыстаў. Але гэта яшчэ ня посьпех. Трэба памятаць, што 75 проц. усяго складу трактарыстаў — камсамольцы, моладзь. Кожны камсамолец-трактарыст павінен уключыцца ў конкурс. І ня толькі ўключыцца. Штодзенна па-бальшавіцку змагацца за посьпех веснавой сяўбы, за моцны бальшавіцкі калгас — ганаровы абавязак кожнага камсамольца-трактарыста.

Трэба адзначыць, што партыйныя ячэйкі яшчэ дрэнна кіруюць работай па конкурсе, які праводзіцца камсамолам.

Кожная парт'ячэйка калгасу МТС, саўгасу павінна вылучыць спэцыяльнага таварыша, які быў бы адказным за кіраўніцтва конкурсам. Парт прымацаваны па конкурсе трактарыстаў абавязан практычна дапамагчы ў правядзеньні гэтага конкурсу, дапамагчы камсамолу ў барацьбе за ліквідацыю абязьлічкі, за аўладаньне тэхнікай трактарнай справы кожным трактарыстам, за стопроцантнае выкарыстоўваньне магутнасьці трактара і г. д.

Абавязак партыйных ячэек—прыкаваць увагу да конкурсу шырокіх мас рабочых МТС, саўгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў.

Райкомы КП(б)Б абавязаны узначаліць кіраўніцтва конкурсам, канцэнтраваць у гэтым напрамку партыйныя ячэйкі.

С—оў.

Да выбараў новых акадэмікаў

Прэзыдэнт АНБ *Акад. П. ГОРЫН*

НА НОВУЮ СТУПЕНЬ

На чарговай сэсіі Акадэміі Навук Беларусі, якая склікаецца 22 мая, адбудуцца выбары новых акадэмікаў. Выбары маюць вялізарнае значэньне ў справе далейшага разьвіцьця акадэміі. Акадэмія навук павінна ўвабраць у сябе лепшых прадстаўнікоў навукі, якія вырасьлі ва ўмовах бурнага росту нашага сацыялістычнага будаўніцтва, каб яшчэ больш энэргічна павесьці барацьбу за шчыльную ўвязку навукі з сацыялістычным будаўніцтвам.

Наша акадэмія за апошнія два гады можа ганарыцца радам дасягненьняў. Зараз нават нашы ворагі не адважваюцца пярэчыць, што за апошнія два гады Акадэмія Навук Беларусі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, ліквідавала шкоду, нанесеную навуцы нацыянал-дэмакратамі і, стаўшы адной з буйных навуковых устаноў Савецкага саюзу, прымае актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве. Нашы ворагі яўна пралічыліся, думаючы, што пасьля ачышчэньня акадэміі ад нацыянал-дэмакратаў акадэмія загіне. Нават колькасныя даныя, напрыклад, аб павялічэньні за апошнія два гады агульнага ліку супрацоўнікаў акадэміі ў 4 разы, а друкаванай прадукцыі амаль у 5 раз, выразна гавораць аб тым, што нашы ворагі пралічыліся. Наадварот, за апошнія два гады, як нядаўна адзначыў старшыня вучонага камітэту ЦВК СССР тав. А. Луначарскі, Акадэмія Навук Беларусі стала адной з буйнейшых устаноў Савецкага саюзу. «Вялікая, магутная навукова-тэарытычная і практычная акадэмія,—кажа тав. А. Луначарскі,—якая прадстаўляе сабой культурны цэнтр беларускай навукі, мае шчасьце быць непасрэдным сачленам сям'і сацыялістычных народаў,—гэта справа вялізарная, працаваць у ёй—гэта гонар вялікі» («Вестник Ком. Академии» № 2—3, 1933 г., стар. 222).

Але было-б лёгкадумствам спыняцца толькі на дасягнутых посьпехах. Задачы сацыялістычнага будаўніцтва з кожным днём адкрываюць усё новыя і новыя пэрспэктывы для навукі. Другая пяцігодка паставіла перад Акадэміяй Навук Беларусі рад вострых пытаньняў. Акадэмія ў самы бліжэйшы час павінна стаць бальшавіцкім цэнтрам навукова-пасьледчай работы БССР і цэнтрам беларускай сацыялістычнай культуры. Выбары новых акадэмікаў павінны дапамагчы акадэміі ў выкананьні задач, пастаўленых перад ёю камуністычнай партыяй, павінна дапамагчы з большым посьпехам павесьці барацьбу з вялікадзяржаўніцкімі і нацыянал-дэмакратычнымі элемэнтамі, якія недаацэньваюць акадэмію, як адно з буйнейшых дасягненьняў нашага нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

У заключэньне трэба адзначыць, што выбары новых акадэмікаў—гэта справа, якая патрабуе самых уважлівых адносін з боку нашай пралетарскай грамадзкасьці. Толькі актыўны ўдзел шырокіх мас забясьпечыць тое, што вялікі гонар працаваць у акадэміі будзе прадастаўлен вартым будаўніком сацыялістычнай навукі.

Акад. Я. КОЛАС

МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ

Беларуская Акадэмія Навук—стваральнае вялікага бальшавіцкага Кастрычніка і вынік ленінскай нацыянальнай палітыкі. Налічваючы пяць няпоўных гадоў свайго існаваньня, яна мае і сваю пэўную гісторыю. Адарвана ў мінулым ад жывых крыніц жыцьця, ад творчага поступу сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны, будуючыся на старых буржуазных прынцыпах гуманітарызму, з-за свайго нацдзмаўскага кіраўніцтва, малодая Беларуская Акадэмія Навук, пад кіраўніцтвам і пры непасрэднай дапамозе партыі здолела ачысьціць свае рады ад нацдзмаўскага хламу, здолела перабудавацца і стаць вогнішчам сапраўды пралетарскай навукі і культуры, шчыльна ўвязаўшы пляны сваіх работ з патрэбамі сацыялістычнага будаўніцтва, актыўна бяручы ўдзел у вузлавых яго момантах. Яна першая з усіх адпаведных устаноў Саюзу прысьвяціла сваю спэцыяльную сэсію пытаньням павышэньня ўраджайнасьці нашых сацыялістычных палёў. Яна не замкнулася ў сьценах габінэтнай работы, а выходзіць на шырокі прастор актуальных задач свайго часу. Яна абменьваецца сваім дасьведчаньнем, сваёю практыкай з Камакадэміяй, нападжваючы з ёю і іншымі вышэйшымі цэнтрэмі пралетарскай навукі жывую сувязь. Яна зьвязваецца з фабрыкамі і заводамі, каб увабраць у арбіту свае работы іх патрэбы і інтарэсы. Яна-ж высоўвае і тую праблему, на праблему морскага шляху вялікага Дняпра. Належную ўвагу адводзіць яна і праблемам торфу, які ва ўмовах Савецкай Беларусі адыграе выключную ролю.

Малодая Беларуская Акадэмія Навук, зразумела, не пазбаўлена і пэўных хібаў, але гэта тлумачыцца адсутнасьцю ў выстарчальнай ступені адпаведных высококваліфікаваных навуковых сіл, яе ростам і разгортваньнем. На жаль, ня ўсе яшчэ, на ват і адказныя работнікі некаторых наркаматаў, усьвядомілі значэньне Беларускай Акадэміі Навук, як вышэйшага рэспубліканскага цэнтру навукі, і ня ўсе яны прадстаўляюць сабе аб'ём ле здабытнаў і дасягненьняў, што вядзе да недаацэнкі акадэміі, як такой.

Знаходзячыся на рубяжы двух сьветаў, новага—Саюзу ССР, і старога—Заходняй Эўропы, на рубяжы дзьвёх культур, новай, сацыялістычнай, і старой, буржуазнай, Акадэмія Навук Беларусі набывае асаблівае значэньне, значэньне палітычнага парадку і для працоўных мас акупаванай Заходняй Беларусі, чый зрок абарочваецца на акадэмію Савецкай Беларусі, як на цэнтр пралетарскай навукі і культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу.

Майская сэсія Беларускай Акадэміі Навук у павестку свае работы ставіць пытаньне аб выбарах новых акадэмікаў. У сувязі з гэтым кіраўніцтва Акадэміі зварачаецца да партыйнай, савецкай і навуковай грамадзкасьці, да работнікаў на фронце літаратуры і мастацтва, да рабочых фабрык і заводаў, да рабочых саўгасаў і калгасьнікаў жыва адгукнуцца і прыняць актыўнейшы ўдзел у выбары новых навуковых і тэхнічных высококваліфікаваных сіл, памятаючы, якое значэньне надае партыя і савецкая ўлада пытаньням навукі, пытаньням сацыялістычнай культуры і шчыльна зьвязаным з імі пытаньням сацыялістычнага будаўніцтва. У інтарэсах маладой Беларускай Акадэміі Навук, у інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва, на чале кожнага інстытуту, на прынцыпах якіх будуецца навуковая сыстэма акадэміі, як больш адпавядаючая патрэбам вытворства, павінен стаць высококваліфікаваны акадэмік, чыя навуковая прадукцыя спрыяла і будзе ў далейшым спрыяць і дапамагаць сацыялістычнаму будаўніцтву, а гэтым самым яшчэ больш умацуе навуковы аўтарытэт і значэньне самой акадэміі, як галоўнага цэнтру рэспубліканскай пралетарскай навукі і культуры, які кіруе ўсімі навуковымі і дасьледчымі інстытуцыямі на тэрыторыі Савецкай Беларусі.

Капі Максім Горкі, вялікі пралетарскі пісьменьнік Савецкага саюзу, пісаў у сваім пісьце з поваду абраньня яго пачэсным акадэмікам: «Я горжусь званием почетного академика Белорусской Академии Наук», то няхай пэзунгам кожнага навуковага работніка, кожнага сьвядомага грамадзяніна БССР будзе пэзунг: «Я ганаруся тым, што прымаў удзел у будаўніцтве і ўмацаваньні вышэйшага навуковага цэнтру пралетарскай навукі і культуры, Беларускай Акадэміі Навук».

БАЯВЫ СЬЦЯГ БАЛЬШАВІЦКАГА ДРУКУ

Вал. Мядзьведзеў

Канцэнтрацыйныя лягеры ў Германіі

Урад Гітлера ажыцьцявіў сваю пагрозу арганізаваць у розных частках Германіі канцэнтрацыйныя лягеры. Пры існуючым у Германіі надзвычайным становішчы і заціску прэсы, зараз цяжка ўстанавіць, колькі такіх лягераў ужо арганізавана, у якіх мясцох і з якой колькасьцю зьняволеных.

Па тых паведамленьнях, якія зрабіў сам урад у пачатку красавіка, у Германіі існуе, прынамсі, 30 канцэнтрацыйных лягераў для палітычных зьняволеных.

Устаноўлена, што такія лягеры ёсьць у Дахау, у Хэйбэргу каля Штутгарту (Вюртэмбэрг), у Лянгене (каля Дармштаду (Гесэн), у Брэмэне і Гамбургу, у Мюльхэйме (Рэйнская вобласьць), некалькі ў Рурскай вобласьці, два ва Ўсходняй Прусіі, у Браўншвэйгу, у Ордружы ў Цюрынгіі, у Фэсьце, Гогенштэйн (Саксонія), 6-7 у Бэрлін-Брандэнбурскім раёне, з іх адзін у Ораніенбургу, потым у Пфэльцы, каля Расштаду (Бадэн), у Сярэдняй Германіі, у Люнэбургер Гайдэ і ў Сілезіі.

Аб тым, як жывуць зьняволеныя, а іх паводле афіцыяльных даных 30 тысяч, сьведчаць амэрыканскія журналісты, якія па запрашэньні ўраду паведалі гэтыя лягеры, і лісты самих зьняволеных, якія кантрабандай трапілі за границу.

Лягеры адцэлены ад рэшткі сьвету высокай каменнай сьцяной або абнесены жалезнымі кратамі, вышынёй у чалавечы рост, перавітымі калючым дротам. Ад зьняволеных патрабуюць выкананьня цяжкіх прымусовых работ, якія цягнуцца 8-9 гадзін у дзень.

Зьняволеныя, у тым ліку журналісты, пісьменьнікі, інжынэры і г. д., тут маршыруюць пад каманду бязвусых, але таму яшчэ больш жорсткіх і нагных, фашысцкіх штурмавікоў.

У некаторых лягерах зьняволеных прымушаюць кожную раніцу сьпяваць патрыятычныя песьні ў часе спэцыяльнай «гадзіны служэньня бацькаўшчыне». Яды даецца вельмі мала і дрэннай якасьці, жыльлёвыя ўмовы надзвычай кепскія. У пакоях, разьлічаных на 2-3 чалавекі, знаходзяцца па 6-8, а часам і больш зьняволеных.

Фашысцкія турэмшчыкі ня спыняюцца перад рукапрыкладзтвам. Нацыянал-сацыялістычная газэта «Антрыф» зьмяшчае нарыс свайго карэспандэнта аб канцэнтрацыйным лягеры ў Ораніенбургу, каля Бэрліну. «У часе работы зьняволеныя знаходзяцца пад строгім наглядам, але ім прадастаўляюцца вялікія льготы—ім дазволена гутарыць».

Магчымасьць гутарыць зьяўляецца для зьняволеных асаблівай паблажкай, якою хваліцца фашысцкі друк.

У той час, як міністар Герынг «вытирает очки» міжнародным грамадзкай думцы, сьцьвярджаючы, што ў Германіі нікога на зьбіваюць і не катуюць, яго прыдворны орган, які зьяўляецца рупарам «прасьвятленьня і культуры» ясна дае зразумець, як часта і лёгка пускаюцца ў ход гумовыя дубінкі. У тым-жа «Антрыфе» паведамлена аб допыце члена «Рэспубліканскага сьвяту», які пры ўпаміне тумсвай дубінкі, зразумеў «усю сур'ёзнасьць становішча». Ён па ўласным вопыце і па вопыце сваіх таварышоў ведае, як балюча б'е гэта фашысцкая дубінка.

Канцэнтрацыйныя лягеры ў Германіі, у якіх пакутуюць 30 тысяч камуністычных і сацыял-дэмакратычных рабочых, інтэлігентаў і пацыфістаў, зьяўляюцца пячуванай тамбай. Ніякія падстасаваныя справаздачы не перашкодзяць таму, каб праўда аб жудасным становішчы зьняволеных у гэтых лягерох выплыла наверх. Гэта праўда напаўняе абурэньнем сэрцы рабочых усяго сьвету, усіх людзей, якія падтасаваныя справаздачы не чуцьцяў. Яна прымусіць іх падняцца для палкага пратэсту і не супакойвацца да таго часу, пакуль фашысцкія турэмшчыкі ня вызвалядь сваіхахвяр з пекла канцэнтрацыйных лягераў, з турэм і катарэчных дамоў.

Вільі Мюнцэнбэрг.
(Генэральны сакратар Міжрабпому)

ГРАМАДЗКАЕ ХАРЧАВАНЬНЕ—НА САЎГАСНЫЯ І КАЛГАСНЫЯ ПАЛІ!

У барацьбе за посьпех першай веснавой другой бальшавіцкай пяцігодкі, за павышэньне якасьці і прадукцыйнасьці працы калгасьнікаў і работных саўгасаў вялізарнае значэньне набывае паладжаньне сацыяльна-бытавога абслугоўваньня і, у першую чаргу, арганізацыя грамадзкага харчаваньня на калгасных і саўгасных палёх. Добра пастаўленае грамадзкае харчаваньне ў часе пасеўнай і ўборачнай кампаній яўна недаацэньваецца, злачынна ігнаруецца.

Ня толькі рабочыя арганізацыі, ня толькі райспажыўсаюзы, саўгасныя гаспадаркі, праўленьні калгасаў, але і цэнтральныя гаспадарчыя органы, на якіхускладзена адказнасьць за паладжаньне грамадзкага харчаваньня, не аддаюць гэтай справе належнай увагі. Давоўі сказаць, што да гэтага часу яшчэ няма дакладна распрацаванага пляну, дзе і колькі трэба арганізаваць сталовак, дзе і колькі павінны працаваць палявыя ачагі, які кантынгент рабочых саўгасаў і калгасьнікаў яны павінны абслугоўваць.

Замест такога пляну ў Наркамземе, Упаўнаркамсаўгасаў, Трактарацэнтрах і Белкаапхарчы складзены, «арыентыровачныя» пляны, заснаваныя па... узятых «са столі» паказальніках.

Наколькі нясур'ёзна і безадказна некаторыя арганізацыі падыходзілі да пляніраваньня грамадзкага харчаваньня паказвае прыкладная Збожжатрактарацэнтрам у Белкаапхарч заяўка на патрэбнасьць кадраў і інвэнтару для сталовых і палявых ачагоў. У гэтай заяўцы ўсе паказальнікі механічна пранумераваны: колькасьць рабочых як пастаянных, так і сэзонных, ва ўсіх 15 МТС, якія аб'яднаны Збожжатрактарацэнтрам (за выключэньнем Случкай), паказана аднолькавая. Тое самае і з колькасьцю ўтрымацтваў: ва ўсіх МТС, па даных Збожжатрактарацэнтру, ёсьць аднолькавая колькасьць **утрыманцаў (103 чалавекі).**

З гэтых штампаваных лічбаў работнікі Збожжатрактарацэнтру выходзілі пры складаньні пляну забясьпечэньня кадрамі і інвэнтаром сталовак МТС. Можна меркаваць аб «якасьці» і «рэальнасьці» такога пляну!

Паводле арыентыровачнага пляну Белкаапсаюзу да пачатку сяўбы павінна было быць арганізавана у калгасах 100 сталовак і 491 пункт палявога харчаваньня. Але ўменна таму, што гэты плян быў намечан без пэўных падстаў, без рэальнага ўліку саўгаўных патрэб, нават без даных аб колькасьці калгасаў у БССР, ён аказаўся пераменшаным... звыш чым у 10 раз. Зараз замест 100 сталовак у калгасах вызначана арганізаваць 1.105 сталовак, замест 491 палявога ачага—1.085.

Белкаапхарч, які заклікан кіраваць работай сталовак, ня ведае, што робіцца на месцах, дзе іх яшчэ трэба адкрыць, што робяць у ім тым напрамку мясцовыя арганізацыі і г. д. Ня ведае і ня кіруе гэтай работай.

У Белкаапхарчы наогул існуе такі настрой, што «наша справа—гэта толькі снабжаць сталоўкі кадрамі і інвэнтаром (аб становішчы гэтай работы скажам ніжэй.—С. Г.), а далей няхай клапоцяцца іншыя арганізацыі». Адсюль і адсутнасьць належнага інструктажу і жывога кіраўніцтва місавой сыстэмай, адсутнасьць сувязі з райспажыўсаюзамі, з рабкопамі.

Між тым райспажыўсаюзы ў значнай частцы абсачэтна нічога ня робяць для арганізацыі грамадзкага харчаваньня ў калгасах і саўгасах, лічаць, што гэта іх не датычыць. **Дзяржынскі** райспажыўсаюз, напрыклад, ні разу не абгаварыў пытаньня аб грамадзкім харчаваньні на пасеўкампаніі. Старшыня праўленьня нават ня ведае, у якіх калгасах і саўгасах работу ўжо ёсьць сталоўкі, а дзе іх яшчэ няма. Паводле ўласнага прызнаньня, ён гэтым проста ня цікавіўся. Такое-ж становішча і ў **Аршанскім, Магілеўскім, Лепельскім, Чашніцкім** і многіх іншых райспажыўсаюзах.

Ня лепш кіруюць справай арганізацыі грамадзкага харчаваньня і цэнтральныя гаспадарчыя органы. Пачнем з **Упаўнаркамсаўгасаў БССР.** Грамадзкім харчаваньнем займаецца «між іншым» нам. упаўнаважанага НК саўгасаў тав. **Сьмірноў,** які сам прызнае, што работа пастаўлена вельмі слаба. У саўгасах БССР ужо існуюць 451 сталоўка і 577 палявых ачагоў.

Большасьць сталовак не забясьпечана неабходнымі прадуктамі на пэрыяд пасеўкампаніі. Пляны ўкамплектаваньня адкормачных пунктаў пры сталоўках выкананы: па кароўах на 13,6 проц., па сьвіньнях — 55,7 проц. Нават такімі прадуктамі, як гародніна і бульба, саўгасныя сталоўкі не забясьпечаны поўнасьцю. Гэта—вынік дрэннай работы саміх саўгасаў і мясцовай каапэрацыі, якая абслугоўвае саўгасы і якая павінна адыграць рашаючую ролю ў паладжаньні грамадзкага харчаваньня, сканцэнтраваць усю ўвагу на снабжаньні саўгасных сталовак прадуктамі і на паляпшэньні якасьці харчаваньня.

Рабкопы, спажыўсаюзы, якія абслугоўваюць саўгасы, **не разгарнулі самазагатовак,** не разумеюць, што гэта аснова шляхі пашырэньня прадукцыі ўсіх фондаў грамадзкага харчаваньня. Такое становішча магло скласьціся толькі таму, што партыйныя арганізацыі саўгасаў ня ўлічваюць значэньня грамадзкага харчаваньня, як адзнаго з важнейшых фактараў узьнімцця прадукцыйнасьці працы, працоўнай дысцыпліны.

Па МТС з арганізацыяй грамадзкага харчаваньня ня лепш. Мы ўжо прывялі вышэй факт, які сьведчыць аб нясур'ёзных і безадказных адносінах да гэтай справы з боку Збожжатрактарацэнтру. Падамо яшчэ адзін факт з **бульбагарадніка Трактарацэнтру.** Тут грамадзкім харчаваньнем павінен займацца загадчык сэктарам снабжэньня тав. **Кудзін.** Павінец, але... не займаецца. Як выявіла брыгада ЦКК РСІ усё «кіраўніцтва» ў гэтай галіне зьвялося да вынясьненьня адносіны ўсім МТС з просьбай... паведаміць аб становішчы грамадзкага харчаваньня...

У Наркамземе БССР толькі 28 сакавіка спусьцілі дырэктывы ў раёны па пытаньні аб грамадзкім харчаваньні ў калгасах і саўгасах. Толькі зараз (калі сяўба ўжо ў разгары!) заняліся разьвёрсткай пляну арганізацыі сталовак і палявых ачагоў на асобных раёнах.

У НКЗ справа арганізацыі грамадзкага харчаваньня таксама недаацэньвалася, як і ва ўсіх вышэйпамянёных гаспадарчых органах. Колькі і ў якіх калгасах ужо арганізаваны сталоўкі і палявыя ачагі? як яны працуюць? ці забясьпечаны яны прадуктамі, кадрамі, інвэнтаром? — аб гэтым у Наркамземе нічто ня ведае, у тым ліку і адказная па грамадзкім харчаваньні тав. **Седзіна...**

Важнейшай задачай у паладжаньні грамадзкага харчаваньня зьяўляецца **падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў.** Аднак, ня гледячы на неаднаразовыя паказаньні і дырэктывы ЦКК-НК РСІ, гаспадарчыя органы і Белкаапхарч зрываюць гэту работу. Яны заняты... недамалёваньнем спрэчкамі хто і колькі павінен несьці выдаткаў на правядзеньні курсаў кухароў, але аб практычнай работе пакуль што, відаводна, ня думаюць.

З-за недадрыхтаванасьці і позадкаўленасьці на месцах былі сарваны месячныя курсы кухароў, арганізаваныя Белкаапхарчам у **Магілеве, Верхнядзьвінску** і іншых раёнах. У Магілеве на курсах замест 30 чалавек сабраліся 7, у Верхнядзьвінску замест 20—6 чалавек. У Дзяржынску замест 20—9 чалавек і г. д. Зрыў курсаў вынікае простым вынікам неразуменьня многімі работнікамі мясцовых і нават цэнтральных арганізацый важнасьці падрыхтоўкі кадраў. Работнік Упаўнаркамсаўгасаў тав. **Гасэн** заяўляе: «Былі б толькі прадукты, а абед любая жанчына зварыць».

Наўрад ці трэба даказваць усю шкоднасьць такіх настрояў. Усякая недацэнка падрыхтоўкі кухарскіх кадраў вядзе па сутнасьці да зрыву грамадзкага харчаваньня ў калгасах і саўгасах.

Зусім нездавальняюча стаіць справа з кухонным і сталовым **інвэнтаром.** Тут таксама засталіся невыкананымі дырэктывы ЦКК НК РСІ, якія прапанавалі ўсім гаспадарчым органам заключыць адпаведныя дагаворы як на падрыхтоўку кадраў, так і на забясьпечэньне інвэнтаром.

Да гэтага часу ні адзін такі дагавор не заключан. У выніку Белкаапхарч ня мае дакладнага пляну адгрузкі інвэнтару і робіць гэта **«як яму ўздумаецца».** Зразумела, што пры такім «парадку», выразнасьці і апэрацыйнасьці ў рабоце чакаць ня прыходзіцца. Ёсьць факты, калі інвэнтар, адгружаны некаторым райспажыўсаюзам, апошнімі не выкупляецца і вяртаецца назад, або прадаецца мясцовымі банкамі з таргоў. Так, напрыклад, **Касьцюковіцкі** райспажыўсаюз адмовіўся выкупіць адгружаныя яму 5.000 лыжак. **З Церахоўскага, Рэчыцкага, Старобінскага** і іншых раёнаў тэлеграфуюць, што адгружаны інвэнтар не выкупляецца з-за адсутнасьці кредытаў.

Між тым у кухонным і сталовым інвэнтары адчуваецца вострый недахват. Асабліва дэфіцытнымі зьяўляюцца тэрмасы, бляхі, пакшы, вілкі, каўшы, кацілы, кіпяцільнікі, вёдры, скаварады і інш. Праўда, **Белкаапхарч** заключыў дагавор па выраб гэтага інвэнтару з **Белкаапрамкааператыўсаюзам** і Барысаўскім заводам **«Чырвоны металіст».** Але, па-першае, заключаныя дагаворы далёка не задавальняюць усёй патрэбы ў інвэнтары, па-другое, гэтыя дагаворы выконваюцца заводам і арцелямі вельмі марудлівымі тэмпамі. Так, Белкаапрамкааператыўсаюз выканаў дагавор толькі на 7,1 проц. Завод «Чырвоны металіст» павінен быў у першым квартале адгрузіць 1000 блях, але не адгрузіў ні адной. Відэльцаў сталовых замест 15.000 шт. адгружана 1.700, каўшоў замест 800—396, лыжак сталовых замест 15.000 — 3.000 і г. д.

* * *

У арганізацыі грамадзкага харчаваньня патрэбен неадкладны і рашучы пералом. Неабходна зараз-жа разгарнуць работу такімі тэмпамі, **каб поўнасьцю навярстаць упушчаны час, каб хутка па-баявому ліквідаваць прарывы на гэтым важнейшым вучастку пасеўнай.** Трэба скончыць з усякай недаацэнкай грамадзкага харчаваньня на калгасных і саўгасных палёх, зламаць кулацкае супраціўленьне, кулацкі сабатаж гэтага мерапрыемства.

Наркамзем, Упаўнаркамсаўгасаў, Трактарацэнтр, Белкаапхарч, партыйныя і савецкія арганізацыі на мясцох абавязаны забясьпечыць нармальную і бесьперабойную работу існуючых сталовак і палявых ачагоў і поўнае выкананьне намечаных пляноў арганізацыі новай сеткі грамадзкага харчаваньня.

Усебеларускі конкурс сельспажыўтаварыстваў на лепшае абслугоўваньне веснавой пасеўкампаніі, які зараз праводзіцца, павінен быць шырока выкарыстан для максымальнага паляпшэньня справы грамадзкага харчаваньня, для мабілізацыі ўвагі да работы сталовак і палявых ачагоў у калгасах і саўгасах з боку сыстэмы спажывецкай каапэрацыі. Райспажыўсаюзы і сельспажыўтаварыствы павінны памятаць, што добрая пастаўлена грамадзкага харчаваньня ў часе пасеўнай і ўборачнай кампаній—адна з важнейшых умоў ажыцьцяўленьня, адзін з важнейшых паказальнікаў работы спажыўсыстэмы.

Вялікую ролю ў арганізацыі грамадзкага харчаваньня павінны адыграць **прафсаюзы, фабзаўкомы, СРС'ы, грамадзкія ЗРК, шэфтаварыствы.** Яны абавязаны дапамагчы ў паладжаньні грамадзкага харчаваньня ў калгасах, у паляпшэньні калгасных інвэнтарам, кадрамі інструктажам і

БАЯВЫЯ ТРАДЫЦЫІ „ПРАВДЫ“—УСЯМУ БАЛЬШАВІЦКАМУ ДРУКУ

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ ЯШЧЭ ВЫШЭЙ УЗЬНІМЕМ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ ДРУКУ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ПАБУДОВУ БЯСКЛЯСАВАГА ГРАМАДЗТВА

Магутная сіла

«...Друк павінен расьці не па днёх, а па гадзінах, гэта—самая вострая і самая моцная зброя нашай партыі». (І. Сталін).

Цяпер вельмі рэдка можна сустрэць калгас, у якім няма сваёй насьценнай газэты. Пізавы друк у МТС, саўгасах, калгасах і калгасных брыгадах вырас колькасна і якасна; яго роля і значэньне ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ўстанаўленьне цьвёрдай дысцыпліны, за нератварэньне калгасаў у бальшавіцкія—усё больш і больш узрастае. Многія насьценныя газэты з'явіліся сапраўднымі цэнтрамі сацыялістычнага спаборніцтва, сапраўднымі арганізатарамі калгаснікаў.

Брыгадная насьценгазэта стала «неадлучнай часткай усёй гаспадарчай, партыйнай, масава-растлумачальнай работы ў брыгадах» («Правда»). Брыгадзіры ў калгасах, лепшыя калгаснікі-ўдарнікі праз сваю насьценгазэту арганізуюць масы, змагаюцца з лодырамі і прагульшчыкамі, кадцягваюць адстаючых, па-сацыялістычнаму перавыхоўваюць калгаснікаў.

Сотні і тысячы брыгадных насьценгазэт у калгасах паказалі бальшавіцкія ўзоры барацьбы за выкананьне заданьняў на сяўбе; гэтыя газэты ў сваёй штодзённай рабоце дапамагаюць брыгадзірам мабілізаваць калгасныя масы па выкананьне пастаўленых перад імі задач.

Многія калгасы і паасобныя калгасныя брыгады ў дзень першага мая рапартавалі аб датэрміновым выкананьні сваіх заданьняў па сяўбе. Вялікую ролю ў барацьбе за выкананьне гэтых заданьняў адыграў і наш пізавы друк. Вось некалькі яркіх прыкладаў.

У «Зьвязьдзе» ўжо было адзначана (перадавы артыкул № 93), што калгас «Х зьезд саветаў Беларусі» (Ельскі раён) першым у БССР скончыў сяўбу аўса. Лепшай у гэтым калгасе па сяўбе паказала сябе брыгада тав. **Каваленкі.** Яна першай выйшла ў поле. Брыгада т. Каваленкі ў пачатку сяўбы выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва брыгаду № 2. Яна (брыгада т. Каваленкі) ўжо на 8 красавіка выканала заданьне па засеву аўса, пшаніцы. Гэтая брыгада перамагла таму, што ў яе належным чынам пастаўлена вытворчая дысцыпліна; кожны член брыгады добра ведае свае заданьні, у брыгадзе вядзецца ўпартая барацьба за высокую якасьць працы, у брыгадзе ёсьць баявая насьценгазэта. **«Многа дапамагае ў рабоце брыгады штодзённа «БАЯВЫ ЗАКЛІК».** На яе старонках красуюцца прозьвішчы ўдарнікаў, ганьбуюцца ліжаўдарнікі. Праз штодзённку кожны ўдзельнік брыгады ведае, як выконваюцца заданьні на сяўбе. Штодзённка мабілізуе калгаснікаў на выкананьне пунктаў сацдагавору з брыгадай № 2—вось ацэнка, якую даюць насьценгазэце «Баявы заклік».

У Віцебскім раёне па ініцыятыве рэдкалегій насьценных газэт калгасаў імя **Дзяржынскага, «Бальшавік», імя Мархлеўскага,** Рудніцкага сельсавету, абвешчана раённае спаборніцтва калгасных газэт на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы.

У сваім лісьце памянёныя рэдкалегіі пішуць: «Спаборніцтва калгасных газэт зьвяжа магутным вагаром прыцягненьня рэдкалегій, селькораў да ўдзелу ў веснавой. Мы, рэдкалегіі трох насьценных газэт калгасаў..., заключылі 17 красавіка сацдагавор на лепшы ўдзел у правядзеньні веснавой кампаніі... Адначасова праз газэту «Віцебскі пралетары» мы кідаем клічу усім калгасным газэтам нашага раёну пасьледаваць нашаму прыкладу».

Шмат бліскучых прыкладаў узорнай работы пізавога друку ў калгасах і калгасных брыгадах можна было-б прывесьці, але і паданыя прыклады даволі ясна нам паказваюць, наколькі вырасьлі роля і значэньне пізавых насьценгазэт у барацьбе за бальшавіцкае ажыцьцяўленьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва. Надзвычай ярка падкрэсьліла гэта «Правда» ў сваім агляде друку «Газэта калгаснай брыгады» (№ 115). Яна адзначыла: «Маленькая насьценная газэта, напісаная да жалю часамі няпісьменна, стала ўжо вялізарнай сілай у калгасе. З ёю лічацца, да яе прыслухоўваюцца».

Многія лепшыя брыгадзіры ў калгасах па-бальшавіцку ўявілі сілу гэтай маленькай насьценнай газэты і яны правільна падкрэсьліваюць, што дабіцца большых посьпехаў у рабоце можна пры дапамозе сваёй брыгаднай насьценнай газэты.

«Я селькор таму, што я брыгадзір—гаворыць удзельнік усесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў т. **Саўкін.**—Мне нельга ня пісаць. Брыгада—справа складаная, людзей шмат і ўсіх трэба па-новаму, па-сацыялістычнаму перавыхоўваць, пераконваць, пераўляць. Як-жа я без ячэйкі і без насьценгазэты ды з гэтай справай спраўлюся? Маё вуснае ўказаньне адзін чалавек чуе, а ўказаньне, якое я ў заметцы праз газэту раблю, у сто раз гучней раздаецца».

Насьценныя газэты ў калгасных брыгадах, у самай гушчы калгасных мас ствараюць вялізарнейшыя магчымасьці для ўжываньня найбольш дзейсных форм і мэтадаў масавай работы. Лепшыя рэдкалегіі насьценных газэт у часе падрыхтоўкі і ў пэрыяд правядзеньня веснавой сяўбы шырока ўжываюць такія формы і мэтады масавай работы, як арганізацыя рэйдаў, абмен вопытам работы, пасылка сыгнальных лісткоў, дошак гонару, пераклічка ўдарнікаў і брыгадзіраў і г. д.

Пад кіраўніцтвам партыі пізавы друк вырас у магутную сілу, ён згуртаваў і згуртоўвае вакол сябе вялізарнейшы актыў селькораў, ён дапамагае партыйным ячэйкам стварыць у калгасах моцны актыў, завяваць большасьць калгаснікаў, такую большасьць, «якая пры ўсіх і ўсякіх умовах будзе змагацца за калгас, будзе змагацца за яго аздараўленьне, за яго ўмацаваньне, змагацца супроць тых антысавецкіх элемэнтаў, якія прабуюць проціпаставіць калгас пралетарскай дзяржаве, змагацца за выкананьне ўсіх абавязацельстваў перад дзяржавай». (Кагановіч).

Перад пізавым друкам стаяць вялізарнейшыя задачы. Раённыя газэты, партыйныя ячэйкі павінны дапамагчы калгасным насьценным газэтам сваім пастаянным кіраўніцтвам і парадаю, канкрэтным паказам лепшага вопыту работы паасобных насьценгазэт, дэталёвай крытыкай недахопаў іх работы і выразнай кваліфікацыяй іх памылак. Толькі пастаянная дапамога партыйных арганізацый узьніме на вышэйшую ступень работу пізавой газэты, узьніме яе ролю ў барацьбе за генэральную лінію партыі, у барацьбе з клясавым ворагам і апартуністамі розных колераў, у барацьбе за пасьпяховае завяршэньне веснавой сяўбы першага году другой пяцігодкі, за бальшавіцкую падрыхтоўку і правядзеньне прапалачнай і ўборачнай кампаній і своячасовае выкананьне ўсіх абавязкаў перад дзяржавай.

Б. Шпітальнік.

Вышэй сьцягі рабселькораўскага руху

Тав. Сталін у сваёй справаздачы на XIII зьезьдзе партыі назваў рабселькораўскія арганізацыі **«вольнымі арганізацыямі грамадзкай ініцыятывы».** Ён прадракаў рабселькорам вялікую будучыню **«выяўніка і магутнага правадніка волі пралетарскай думкі».**

Прадраканьне правадыра поўнасьцю апраўдалася. Рабселькораўскі рух вырас у вялізарную палітычную сілу, стаўшы моцнай апорай бальшавіцкага друку і мацнейшай зброяй умацаваньня яго сувязі з масамі. Дзесяткі і сотні тысяч рабселькораў пішуць у нашы газэты аб недахопах і дасягненьнях работы заводаў, фабрык, калгасаў, саўгасаў і МТС. Некалькі сот тысяч насьценных газэт робяцца рукамі рабселькораў пад ідэйным кіраўніцтвам партарганізацый і пры актыўнай дапамозе савецкай улады. Рабселькоры дапамагаюць нашай партыі змагацца з разгромленым, але недабітым яшчэ кулацтвам, са шкоднікамі, з апартуністамі, з усімі, хто перашкаджае сацыялістычнаму будаўніцтву.

Высока ўзьнімаючы ў дзень друку бальшавіцкія сьцягі рабселькораўскага руху, рабселькоры павінны шырока разгарнуць самакрытыку і выявіць нашы недахопы, вынесьці ўрокі з ранейшых памылак. Прамова тав. Постышава на абласным зьезьдзе рабселькораў Харкаўшчыны адносіцца да ўсіх рабселькораў Савецкага саюзу. Ва многіх мясцох голас селькора стаў слабейшым, чым ён павінен быць. Вазьмеце кубанскіх селькораў. Дзе былі многія з іх, калі кулак арганізоўваў сабатаж збожжазагатовак? А хіба ў нас ў раёне няма такіх селькораў, якія дрэнна сыгналізуюць партыі аб новых манэўрах кулацтва? Адсюль вывад—**мацней трымаць у руках пяро селькора—аблічыцеля клясавага ворага і шкоднікаў.** Нельга быць арганізатарам, не аблічаючы ворага, не выкрываючы яго ў друку і непасрэдна на заводзе, у калгасе або ў саўгасе.

Зьяўляючыся арганізатарамі і правадзнікамі грамадзкай ініцыятывы, селькоры асабліва павінны ўзьняць сваю ролю. Зараз ва ўсіх калгасах падняцца вялізарная хваля творчай самадзейнасьці і пачын у дзесяткаў тысяч перадавых калгаснікаў-ударнікаў, якія рашуча ўяліся за барацьбу з лодырамі, рвачамі, прагульшчыкамі, раскрадальнікамі калгаснай уласнасьці.

Чэсная калгасная праца ўсіх—вось за што змагаюцца ўсе сумленныя калгаснікі. І ў гэтай справе вялізарную карысьць прыносіць ім сельскараўская крытыка—крытыка дрэннай работы на палёх, дрэннай сяўбы, дрэннай уборкі, дрэннага догляду каня і трактара і г. д. Крытыка гэта б'е па канкрэтных носьбітах зла. За дзелавой, сьмелай, сумленнай крытыкай селькора-ўдарніка пойдуць усе сумленныя калгаснікі.

Вось чаму партыя падтрымлівае крытыку селькораў, змагаецца за яе дзейснасьць, абараняе гэту крытыку і селькораў ад прасьледваньняў клясавага ворага, бюракратаў і апартуністаў. Селькоры павінны сьмялей і бязьлітасьней крытыкаваць недахопы ў калгасах, паказваючы ў той-жа час станоўчыя бакі работы ўдарнікаў сацыялістычных палёў.

Селькорам трэба шчыльней згуртавацца вакол палітаддзелаў МТС, ствараных партыяй для дапамогі калгаснай вёсцы, для цаляпшэньня масавай работы, для ўмацаваньня калгаснай вытворчасьці, для хутчэйшага правядзеньня ў жыцьцё ўказаньняў тав. Сталіна аб тым, каб зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі і ўсе калгасы бальшавіцкімі.

Важнейшай задачай селькораў зьяўляецца паляпшэньне іх работы ў калгасным друку.

Насьценгазэта, над якой працуе 2-3 чалавекі—не газэта. Кожнаму калгасу патрэбны не адзінкі, а дзесяткі і сотні селькораў, не адзінкі, а масавы ўдзел у газэце калгаснікаў, дзесяткі і сотні лістоў калгаснікаў. Патрэбна масавая работа газэт (конкурсы, агляды, рэйды, пераклічкі). Патрэбны баяздольныя ўдарныя рэдкалегіі для гэтых газэт. Патрэбен удзел у рабоце пізавога друку камуністаў, камсамольцаў, кіраўніцтва парт'ячэек. Толькі пры гэтых умовах пізавы друк будзе ў калгасе ганаровым памочнікам партыі і правадніком яе генэральнай лініі.

Б. Гарэлік.



СПАБОРНІЦТВА ДРУКУ БССР І ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ

„Зьвязда“ і „Рабочий путь“ (Заходняя вобласьць) абмяняліся аглядамі двух газэт, паказваючы іх штодзённую барацьбу за пасьпяховае правядзеньне сяўбы. Таксама як і у нас „Рабочий путь“ друкуе у сёняшнім нумары гэтыя 2 агляды

„Даганяй лепшых і дабіся агульнага ўздыму“

„Ударнік“—Новаэыбкаў, „Труд“—Клінцы

Спаборніцтва пачалося так.

Тысяча пяцьсот дэлегатаў усесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў, лепшых майстраў зямлі, абвясьцілі ўсім калгасам, усім калгаснікам, усім працоўным Савецкага саюзу:

«Мы абвяшчаем усесаюзнае спаборніцтва рэспублік, краёў, абласьцей, раёнаў, МТС, саўгасаў і калгасаў на самую высокую ўраджайнасьць».

Заклік дэлегатаў усесаюзнага зьезду калгаснікаў быў пачут ва ўсіх куткох Савецкага саюзу.

Калгаснікі Новазыбкаўскага раёну адказалі на гэты заклік новым уздымам актыўнасьці. Яны паранылі:

«Уключаемся ва ўсесаюзнае спаборніцтва».

У раёне разгарнулася шырокая падрыхтоўка да абласнога зьезду калгаснікаў. На перадзьезьдаўскай трыбуне, арганізаванай раённай газэтай «Ударнік», калгасы дзеляцца вопытам сваёй падрыхтоўкі да сяўбы, рапартуюць аб гатоўнасьці сустрэць сяўбу ўсеўзбраеньні, уступаюць у спаборніцтва на лепшы ўраджай.

Але гатоўнасьць калгаснікаў да сяўбы яшчэ не забясьпечвае посьпеху сяўбы ў раёне.

«Аднаасобны сэктар, які складае 60 проц. сялянскіх гаспадарак у раёне, павінен засеяць 20.427 га, або 49,5 проц. пасеўнай плошчы»...

А між тым:

«Падрыхтоўка да веснавой пасеўнай у аднаасобным сэктары ў нашым раёне ідзе слаба...»

«Ударнік» заклікае:

«Па прыкладу калгасаў патрэбна разгарнуць сацспаборніцтва сярод аднаасобнікаў на лепшае выкананьне сваіх абавязацельстваў».

За словам ідзе справа. Газэта арганізуе спаборніцтва аднаасобнікаў і вядзяляе гэта зьвяно падрыхтоўкі да сяўбы на сваіх старонках у самастойнае пытаньне.

І калі ў адказ на адозву ўсесаюзнага зьезду ў спаборніцтва ўступілі шырокія масы і калгаснікаў, і аднаасобнікаў, калі ім дапамаглі ў барацьбе за першую сяўбу другой пяцігодкі рабочыя новазыбкаўскіх фабрык, калі спаборніцтвам былі ахоплены дзесяткі калгасаў, сотні аднаасобнікаў, рабочыя, шэфскія ячэйкі,—новазыбкаўскі райком партыі вынес пастанову:

«Выклікаць на сацспаборніцтва Клінцоўскі раён на лепшую падрыхтоўку і арганізацыю веснавой сяўбы».

Дагавор падпісалі на раённым зьезьдзе клінцоўскіх калгаснікаў-ударнікаў, які адбыўся напярэдадні абласнога зьезду.

У Клінцох таксама рыхтаваліся да сяўбы. Калгаснікі, адказваючы на заклік усесаюзнага зьезду, уступалі ў спаборніцтва. Рыхтуючыся да свайго раённага зьезду, канчалі ссыпку насеньня, рамонт інвэнтару, складаньне вытворчых плянаў. Рапартавалі аб гэтым зьезду.

Але ў цэлым па раёну падрыхтоўка да сяўбы зацягвалася. Раён адставаў з-за аднаасобнага сэктару.

Новазыбкаў уступаў у спаборніцтва з большымі перавагамі. Ссыпка збожжавага насеньня ў калгасах была праведзена на 113 проц., страхфонд на 107 проц., плугі былі адрамантаваны на 89,5 проц., сявяркі на 153 проц. Страхфонд у аднаасобным сэктары сабран на 107 проц., пляны сяўбы даведзены да кожнага двара поўнасьцю. Але гэта не турбавала клінцоўскіх арганізацый.

«Ударнік» добра ўлічыў, якую арганізуючую сілу прадстаўляюць сабой дэлегаты абласнога зьезду. Газэта друкуе гутаркі з імі, дае справаздачы аб тым, як яны працуюць, вярнуўшыся ў калгасы, і гэтым арганізуе масы на выкананьне пастаноў зьезду. Хваля выкананьне пастаноў зьезду. Хваля выкананьне пастаноў аднаасобнікаў і аднаасобнікаў у Новазыбкаўскім раёне расьце.

З ростам актыўнасьці калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў у падрыхтоўцы да сяўбы ўзрастае і апэрацыйнасьць «Ударніка». У кожным нумары газэты адчуваецца яе мэтаімкнёнасьць і нарастальнае барацьбы за пасьпяховую сяўбу. Да раённага зьезду калгаснікаў яна ўжо шырока разгарнула спаборніцтва паміж калгасамі і аднаасобнікамі, арганізавала «мітынг коняй», паставіла ўсю суму пытаньняў, зьвязаных з сяўбой.

І калі раённы зьезд калгаснікаў-ударнікаў заявіў:

«Да 25 сакавіка нашы калгасы будуць гатовы да сяўбы. Прапануем арганізаваць у гэты дзень пробны выезд у поле»,—

газэта мела права лічыць, што гэта гатоўнасьць—рэзультат і яе немалых намаганьняў.

А ў Клінцох і пасьля абласнога зьезду становішча ў асноўным заставалася ранейшым. На першы погляд «Труд» быццам вядзе дзейную падрыхтоўку да сяўбы. У «шапках», у падборках ён аддае ўвагу ўсім пытаньням: арганізацыі працы, якасьці, кашю, трактару, спаборніцтву, разьмеркаваньню даходаў і інш. А на самой справе ні адным з гэтых пытаньняў газэта як сьлед не займалася.

І у Новазыбкаве, і асабліва ў Клінцох яшчэ вялікая ўдзельная вага аднаасобнага сэктару: у Новазыбкаве—63 проц., у Клінцох—67 проц. Гэта шмат да чаго абавязвае раёны, якія спаборнічаюць. І новазыбкаўскія арганізацыі добра гэта ўсьвядомілі. Побач з калгаснікамі яны ўцягваюць у спаборніцтва аднаасобнікаў. «Ударнік» вядзе асобную арганізацыйную работу з аднаасобнікам.

«Труд» друкуе рад перадавых аб аднаасобніку (праўда, з некаторымі недакладнасьцямі, якія «Рабочий путь» своячасова выправіў). Райком партыі выносіць пастанову, якая абавязвае партарганізацыі.

«Павярнуцца тварам да сельскай гаспадаркі».

У раёне адбываецца паварот тварам да сельскай гаспадаркі. Фабрычныя арганізацыі накіроўваюць у вёску рабочыя брыгады—рамонтныя, рахунковыя, агранамічныя, агітацыйныя. Газэта абвяшчае спаборніцтва аднаасобнікаў. У вёсцы разгортваецца масавая работа.

Але газэта «Труд» дрэнна выкарыстоўвае спрыяючыя ўмовы для арганізацыі сапраўднага спаборніцтва аднаасобнікаў на лепшую сустрэчу сяўбы.

За паўтары-два месяцы да пачатку масавай сяўбы «Ударнік» правёў рад вялікіх арганізацыйна-масавых мерапрыемстваў, па-сапраўднаму разгарнуў спаборніцтва сельсаветаў, калгасаў і аднаасобнікаў, шырокую праверку гатоўнасьці да сяўбы, правёў раённы зьлёт конюхаў, паслаў выязную рэдакцыю ў Нова-месцкі сельсавет, прымаў удзел у падрыхтоўцы агратэхнічнай канфэрэнцыі, рэгулярна друкаваў дзеньнік спаборніцтва калгасаў і аднаасобнікаў і г. д.

На старонках-жа «Труда» ня відаць такой апэрацыйнасьці і тым больш такога размаху арганізацыйна-масавай работы.

Пробныя выезды, якія адбыліся ў Новазыбкаўскім раёне ў пачатку красавіка і ў Клінцоўскім у сярэдзіне красавіка, паказалі лепшую падрыхтаванасьць да сяўбы новазыбкаўцаў.

«У выезьдзе прынялі пагаловуны ўдзел усе калгаснікі, якія зьявіліся па-брыгадна...

Пробны выезд ператварыўся ў баявы агляд гатоўнасьці да сяўбы. Усе 180 коняй прызнаны годнымі для палявых работ. Кожная брыгада мае плян, ведае вытворчы вучастак, дзе і калі трэба сеяць. Паміж брыгадамі заключаны сацдагавары. Усе калгаснікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі... Калгас «Дружный» выклікаў на сацспаборніцтва калгас «Аграном».

Вось тыповае паведамленьне з Карпілаўскага сельсавету. У аспоўным такія-ж паведамленьні надрукаваны з Боркаўскага сельсавету, з калгасаў «Пролетарий», імя Сталіна, «Красный путь» і інш.

У газэце «Труд» пераважалі іншага роду паведамленьні:

«Гэтымі днямі быў пробны выезд і гэты выезд паказаў, што рад ар целяй, рапартаваўшых аб сваёй гатоўнасьці да сяўбы, фактычна не гатовы.

...Трэба адзначыць вялізарную памылку МТС у правядзеньні пробнага выезду, якую паўтарылі ўсе пе калгасы—гэта адрыў ад аднаасобнікаў. Аднаасобнікаў не запрасілі на пробны выезд»,—

мэланхалічна падводзіць «Труд» сумныя вынікі пробных выездаў.

Зразумела, што аналягічныя рэзультаты даў і першы выхад на палі. Старонкі «Ударніка» стракацяць заражаючо-бадзёрымі рапартамі аб першых пераморах у раньняй сяўбе. У «Труде» многія паведамленьні з месц аб раньняй сяўбе заключаюць у сабе атаворкі аб розных недахопах, суправаджаўшых калгаснікаў на палёх.

Новазыбкаўскі раён уступіў у масавую сяўбу з ніўнай перавагай у спаборніцтве з Клінцоўскім раёнам. Гэта абавязвае клінцоўскіх бальшавікоў і, у прыватнасьці, газэту «Труд» з асабліваым напружаньнем змагацца за посьпех сяўбы, за колькасныя і якасныя паказьнікі яе. Новазыбкаўскім-жа бальшавікі, бязумоўна, акажуць ім у гэтай барацьбе таварыскую дапамогу.

Спаборніцтва двух паўднёвых абожжавых раёнаў на лепшую сяўбу павін на ісьці так: адстаючыя даганяюць лепшых, лепшыя дапамагаюць адстаючым. Тады раёны, якія спаборнічаюць, бязумоўна, дабіцца агульнага ўздыму.

ЗА ПЯРШЫНСТВА Ў СПАБОРНІЦТВЕ

„Віцебскі пралетары“, „Бальшавіцкі змагар“—Ельск

Усебеларускі зьезд калгаснікаў-ударнікаў, прымаўшы выклік калгаснікаў Заходняй вобласьці, заклікаў усе калгасы, МТС і саўгасы сваёй рэспублікі па-бальшавіцку разгарнуць паміж сабой спаборніцтва на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы, на заваяваньне пяршынства ў спаборніцтве.

Першымі адгукнуліся на заклік зьезду тры буйнейшыя раёны БССР—Віцебск, Менск, Гомель. Дэлегацыі гэтых раёнаў на ўсебеларускі зьезд, абмяняўшыся вопытам работы, тут-жа на зьезьдзе заключылі паміж сабой сацыялістычны дагавор, указаўшы ў ім канкрэтныя аб'екты спаборніцтва.

***

«Віцебскі пралетары»—орган Віцебскага гаркому партыі—з першых-жа дзён абвяшчэньня спаборніцтва з Заходняй вобласьцю пачаў разгортваць вакол гэтага адпаведную работу, мабілізуючы шырокія масы калгаснікаў і працоўных сялян —аднаасобнікаў на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы.

Друкуючы абавязацельствы дэлегатаў першага ўсебеларускага зьезду калгаснікаў-ударнікаў і абавязацельствы калгаснікаў-ударнікаў Заходняй вобласьці, «В. П.» выступае з заклікам:

«Калгасы Віцебшчыны павінны і будуць першымі ў спаборніцтве па БССР з Заходняй вобласьцю РСФСР».

На другі дзень газэта друкуе сацыялістычны дагавор дэлегацый на ўсебеларускі зьезд калгаснікаў-ударнікаў трох раёнаў—Менску, Віцебску і Гомелю.

Заклікаўшы калгасныя масы свайго раёну змагацца за пяршынства ў спаборніцтве, «В. П.» з дня на дзень вядзе сыстематычную барацьбу за сяўбу, дапамагае калгасам разгортваць паміж сабой спаборніцтва.

З пачаткам палявых работ газэта ўвяла на сваіх старонках спэцыяльны аддзел—«Учора на палёх», дзе кораткa, але выразна даецца малюнак ходу палявых работ у брыгадах. Прав сваіх спэцыяльных карэспандэнтаў, рабселькораў, упаўнаважаных гаркому і гарсавету, «В. П.» штодзённа атрымлівае інфармацыю, як выконваюцца нормы вырыва, якая яго якасьць і г. д. Усё гэта адлюстроўваецца на старонках газэты. Прыведзем невялікую выпрымку з гэтай інфармацыі:

«За чатыры дні ў калгасе імя Будзённага ўзарана толькі 7 га. Прычына слабых тэмпаў у тым, што на полі працуе ўсяго 7 калгаснікаў за мест 22. Ужо з самага пачатку работы адчуваецца дрэнная арганізацыя працы. Брыгадзір брыгады № 2 Казлоў Ціт не дае ўказаньняў калгаснікам, на якую глыбіню яны павінны ўзраць. Праца ад калгаснікаў па якасьці на прымаецца».

Самае добрае ў рабоце рэдакцыі, у асьвятленьні ходу сяўбы ёсьць прыцягненьне на свае старонкі рабселькораў і саміх калгаснікаў, работных саўгасаў і МТС.

З паловы красавіка газэта заклікае калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў разгарнуць масавую сяўбу аўса.

«Выканаць заданьне партыі і ўраду, засеяць да 25 красавіка 2.000 га аўса на Віцебскім раёне—справа гонару ўсіх калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў».

Пад такой шапкай 15 красавіка друкуецца пастанова гаркому аб разгортваньні масавай сяўбы аўса, прынятая на аснове радыяграмы ЦК КП(б)Б і СНК БССР. На заўтра газэта выступае па гэтым пытаньні з перадавым артыкулам, дзе бічуе кіраўніцтва гарсавета за вялікую адмову дрэннага аўса на гатуновы. «В. П.» паказвае прыцягваецца да дурной адказнасьці «шляп» з гарсавета Брыжана і Паўлецка, якія на адсталі пра-бальшавіцку арганізаваць рэалізацію брацкай дапамогі калгаснікаў Горкаўскага краю.

Больш за ўсё «В. П.» піша аб ходзе сяўбы ў калгасным сэктары, не забывае і пра аднаасобнікаў. Кожны часта дае падборкі, дзе выкрываюцца факты ігнараваньня, чаўпадзіны аднаасобнага сэктару асобнымі сельсаветамі, партыйнымі ячэйкамі. Трэба адзначыць, што газэта ва ўсёй сваёй рабоце не абмяжоўваецца канстатаваньнем фактаў, а выкрывае канкрэтных вінаватых ала, робіць адпаведныя высновы, дабіваецца іх ажыцьцяўленьня.

Наогул «Віцебскі пралетары» разгарнуў на сваіх старонках барацьбу за сяўбу на дрэнна. Галоўнае, што гэта барацьба вядзецца пад лёзунгам «За пяршынства Віцебшчыны ў спаборніцтве». Гэтым лёзунгам дыша кожная карэспандэнцыя, якая друкуецца на старонках газэты.

***

Добра разгарнула і вядзе барацьбу за сяўбу і газэта «Бальшавіцкі змагар»—орган Ельскага райкому партыі. Яна таксама праводзіць усю сваю работу з пункту гледжаньня мабілізацыі мас на заваяваньне пяршынства ў спаборніцтве з суседнім Лельчыцкім раёнам.

Ельскі раён па ходзе сяўбы — адзін з перадавых у БССР. Трэба адзначыць, што «Б. З.» у гэтай справе адыграў вялікую ролю. Прагледаючы камплекты за красавік, можна бачыць, як газэта па-бальшавіцку ставіць і ўзьнімае да палітычна-прынцыповую вышыню ўсе пытаньні, зьвязаныя з правядзеньнем сяўбы.

Вельмі важна адзначыць, што са старонак «В. З.» часта гаворыць самі ўдарнікі сацыялістычных палёў—перадавыя калгаснікі, брыгадзіры, старшыні калгасаў.

Газэта праводзіць вялікую арганізацыйную работу па разгортваньні спаборніцтва паміж калгасамі і ўнутры калгасаў. Рэдакцыя арганізавала ліст перадавога калгасу ў раёне «Чырвоная зарада» ўсіх калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў Ельшчыны. Вакол гэтага ліста газэта разгарнула арганізацыйна-масавую работу (арганізацыю водгукаў, канкрэтнымі абавязацельствамі калгасаў).

Аднаасобны сэктар у Ельскім раёне ў пасеўным ляне займае значнае месца—каля 30 проц. пасеўнай плошчы.

Гэта добра ўлічвае «В.З.» і вядзе сыстематычную барацьбу за пасьпяховае правядзеньне сяўбы ў аднаасобным сэктары. Газэта выкрывае і жорстка бічуе ўсіх, хто недаацэньвае і ігнаруе аднаасобніка.

Вось некалькі прыкладаў. 26 сакавіка газэта дае падборку пад шапкай:

«Рашуча змагацца з дзедаўскімі звычкамі, не ігнараваць, а впэрацыйна кіраваць аднаасобным сэктарам».

У гэтай падборцы «В. З.» бічуе асобныя сельсаветы за тое, што яны ўсяго ня ведаюць, у якім становішчы знаходзяцца аднаасобнікі ў сэнсе падрыхтоўкі да сяўбы, і не інфармуюць раённы арганізацыі. 2 красавіка газэта зноў на рабуе:

«Не ігнараваць аднаасобніка, не марудзіць з адводам яму зямлі».

І тут-жа прыводзіць абуральныя факты ігнараваньня аднаасобніка.

***

Паказаныя ў агляднае дадзе газэты даюць рад істотных недахопаў. Але ўсе яны выдзяляюцца з раду іншых барацьбой за пасьпяховае правядзеньне сяўбы на аснове разгортваньня сацспаборніцтва.

Па віцебскай і ельскай газэтах павінны раўняцца і іншыя. Задача ўсіх абласных газэт — мабілізаваць шырокія масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на разгортваньне сацспаборніцтва паміж калгасамі, саўгасамі, брыгадамі. Толькі на аснове разгорнутага сацспаборніцтва ўнутры раёнаў магчымы посьпех спаборніцтва паміж раёнамі, магчыма заваяваньне пяршынства БССР у спаборніцтве з Заходняй вобласьцю.



ПЕРШАГА МАЯ ЗА МЯЖОЙ

МАГУТНЫЯ ПЕРШАМАЙСКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ПАД СЬЦЯГАМІ КАМПАРТЫІ

Германія

БЭРЛІН, 3. (Белта). Агенцтва «Вольфа» паведамляе, што ў ноч на 1 мая на макаўцы царкоўнай званіцы ў БЕРНАУ (каля Бэрліну) быў вывешан чырвоны сьцяг з сярпом і молатам. Уранку першага мая ён з вялікімі цяжкасьцямі быў штурмавікамі зьнят. Да пей у паведамленьні гаворыцца, што калі першага мая раніцай хацелі узьняць нацыянал-сацыялісцкі сьцяг на ратушы ў Бэрнау, дык аказалася, што ўночы ён быў кімсьці ўкрадзен. Паліцыя і штурмавікі арыштавалі 40 «падазроных асоб» і заключылі іх у канцлягер у АРАНІЕНБУРГУ.

Данцыг

ВАРШАВА, 3. (Белта). Згодна паведамленьняў друку, 1 мая ў Данцыгу мясцовыя нацыянал-сацыялісты разам з паліцэйскімі зрывалі вывешаныя на дамох і пляцох камуністычныя сьцягі.

Бэльгія

ПАРЫЖ, 3. (Белта). Згодна вестак, атрыманых з БЭЛЬГІІ, камуністычная партыя арганізавала першага мая ў БРУСЭЛІ, АНТВЭРПЭНЕ, САРЭНЕ, АНДАНЕ ШАРЛЕЎ і ў радзе інш. пунктаў і вугальных раёнаў самастойныя дэманстрацыі. Камуністычныя дэманстрацыі былі значна больш шматлюднымі, чым у мінулым годзе і паказалі рост уплыву кампартыі.

Швэйцарыя

ВЕНА, 3. (Белта). Як паведамляюць швэйцарскія газэты, першага мая ў ЖЭНЭВЕ, БАЗЭЛІ, ЦЮРЫХУ, БЭРНЕ і радзе іншых гарадоў Швэйцарыі адбыліся камуністычныя дэманстрацыі. Ня гледзячы на адмаўленьне с.-д. лідэраў прыняць удзел у прапанаваных кампартыяй аб'яднаных дэманстрацыях, усюды ў камуністычных дэманстрацыях прымалі ўдзел тысячы с.-д. рабочых.

Эстонія

ТАЛІН, 3 (Белта). Выбраная певымі прафсаюзамі і культурна-асьветнымі арганізацыямі Эстоніі першамайская рабочая дэлегацыя ў СССР ня выехала ў Маскву, бо ў дзень ад'езду былі арыштаваны 4 члены дэлегацыі. Распараджэньнем міністра ўнутраных спраў закрыта рабочае культ.-асьветнае таварыства з усімі яго правінцыяльнымі аддзяленьнямі. Таварыства абвінавачваецца « ў сувязі з падпольнымі арганізацыямі эстонскай кампартыі і вядзеньні антыдзяржаўнай агітацыі».

Баўгарыя

ВЕНА, 3. (Белта). Як паведамляюць з САФІІ, ня гледзячы на тое, што ў сувязі з падрыхтоўкай да першага мая было арыштавана каля 800 АКТЫЎНЫХ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ, у шмат якіх гарадох і вёсках БАЎГАРЫІ першага мая былі пашыраны рэвалюцыйныя лістоўкі і вывешаны чырвоныя сьцягі. Чырвоныя сьцягі зьявіліся таксама на некаляльных казармах. Хоць улады абвясьцілі, што спроба дэманстраваць будзе бяз усякага папярэджаньня сустрэчана агнём, у шмат якіх месцах адбыліся дэманстрацыі. Як паведамляе афіцыяльнае баўгарскае агенцтва, у вёсцы СЛАЦІНА жандармы абстрэлялі першамайскую дэманстрацыю, пры чым пры сутычцы было ранена 7 ДЭМАНСТРАНТАЎ і адзін жандар.

Фінляндыя

ГЕЛЬСІНГФОРС, 3. (Белта). Перад першамайскімі дэманстрацыямі ў ФІНЛЯНДЫІ адбыліся арышты сярод рабочых, якія падазраваліся ў камуністычнай дзейнасьці. Тым ня менш у радзе пунктаў (ЛАХТЫ, АБО, КІХНІО і інш.) першага мая адбыліся спробы дэманстраваць пад камуністычнымі лёзунгамі. Спробы спыняліся паліцыяй. Для папярэджаньня камуністычных выступленьняў першага мая ў ГЕЛЬСІНГФОРСЕ былі значна ўзмоцнены паліцэйскія пасты. Сацыял-дэмакраты абмежаваліся ў гэты дзень арганізацыяй мітынгаў. У ГЕЛЬСІНГФОРСЕ арганізован сацыял-дэмакратычны паход, які да месца мітынгу маршыраваў пад вялізарным нацыянальным сьцягам.

Гішпанія

ПАРЫЖ, 3. (Белта). Як паведамляюць з ГІШПАНІІ, першае мая прайшло пад знакам мабілізацыі працоўных мас на аснове адзінага фронту. У МІЕРЭС, у правінцыі Астурыя ў дэманстрацыях, арганізаваных кампартыяй і рэвалюцыйнымі прафсаюзамі, прымала ўдзел 10 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК. У САМА камуністычная і сацыялістычная дэманстрацыі аб'ядналіся ў агульную шматтысячную калёну. У МАРЧЭНА ў Сэвільскай правінцыі большая частка рабочых, якія прышлі на сацыялістычны мітынг дапучаліся да камуністычнай дэманстрацыі. Шматлюдныя камуністычныя мітынгі і дэманстрацыі адбыліся ў БАЛЬБАО, БАДАХОСЕ, ВАЛЕНСІІ, САН, СЭБАСТ'ЯНЕ, ОВ'ЕДА і многіх вёсках АНДАЛУЗІІ і ЭСТРЭМАДУРА. У БАРСЭЛЁНЕ, МАДРЫДЗЕ і СЭВІЛЬІ ў часе камуністычных дэманстрацый адбыліся сутычкі з паліцыяй.

Літва

КАУНАС, 3. (Белта). Як паведамляе літоўскі друк, паліцыя напярэдадні першага мая зрабіла рад арыштаў сярод рэвалюцыйных рабочых. Ня гледзячы на забарону першамайскай дэманстрацыі ў КАУНАСЕ, рабочыя прабавалі дэманстраваць, але былі разагнаны. У Каунасе і ў правінцыі ў многіх месцах былі ВЫВЕШАНЫ КАМУНІСТЫЧНЫЯ СЬЦЯГІ і РАСКІДАНЫ КАМУНІСТЫЧНЫЯ ПРАКЛЯМАЦЫІ.

Нарвэгія

СТАКГОЛЬМ, 3. (Белта). Як паведамляюць з ОСЛО, учора ўночы ў ФРЭДРЫКСТАДЗЕ адбыліся сутычкі паміж рабочымі і паліцыяй у сувязі з арыштам рабочага на першамайскім сходзе. Раніні аднаго рабочага і некалькі паліцэйскіх. Паліцыя была вымушана вызваліць арыштаванага.

Кітай

ШАНХАЙ, 3. (Белта). Ліга грамадзянскіх праў у Кітаі апублікавала заяву, у якой катэгарычна патрабуе вызваленьня 80 дэманстрантаў, арыштаваных у Шанхаі першага мая. Пачаўся суд над арыштаванымі дэманстрантамі, у ліку якіх ёсьць дзяўчына 12 год.

У Германіі ўводзіцца абавязковая працоўная павіннасьць

БЭРЛІН, 4 (Белта). Германскі міністар працы **Зэльдтэ** і статсэкратар па пытаньнях працоўнай павіннасьці **Гірль** выдалі загад аб стварэньні так званых асноўных атрадаў абавязковай працоўнай павіннасьці. У гэтых атрадах 60 проц. адбываючых працоўную павіннасьць павінны быць нацыянал-сацыялістамі ці членамі сталёвага шлему.

З 1-га кастрычніка існуючая цяпер так званая «добраахвотная» працоўная павіннасьць ліквідуецца. Да таго часу асноўныя атрады ахопяць каля 120 тысяч чалавек. **Гірль** заявіў, што ў студзені 1934 г. будзе абвешчан першы прызыў падлягаючых адбываньню абавязковай працоўнай павіннасьці. Прызвана будзе моладзь мужчынскага полу, якой у 1934 г. споўнецца 19 год. Усяго ў два тэрміны будзе прызвана каля 700 тыс. чалавек. У 1934 г. працоўную павіннасьць прызыўнікі будуць адбываць 6 месяцаў, а ў далейшым—на працягу цэлага году. «Уласна кажучы,—заявіў Гірль,—за працоўнай павіннасьцю павінна ісьці вайсковая павіннасьць і толькі пасьля таго, як кожны немец пройдзе гэту падвойную школу, яго можна будзе прызнаць поўнапраўным грамадзянінам і яму можна будзе дазволіць уступіць у шлюб».

ФАШЫСЦКАЯ ЧЫСТКА ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

БЭРЛІН, 3. (Белта). Прускі міністар народнай асьветы **Руст** зноў прадпісаў звольніць рад прафсароў унівэрсытэтаў у **Бэрліне, Кельне, Галле і Ахэне.** Сярод звольненых ёсьць выдатныя прафэсары з вядомымі імёнамі.

У **Франкфурце** на Майне штурмавікі адбіраюць у студэнтаў яўрэяў іх студэнцкія пасьведчаньні. Адначасна яўрэйскім студэнтам прапанавана не зьяўляцца больш на заняткі ў клініці. У **Бэрліне** нацыянал-сацыялісцкая студэнцкая арганізацыя пад пагрозай выключэньня прапануе студэнтам не наведваць лекцый і заняткаў тых нямногіх прафэсароў яўрэяў, якія ня зволены з пасад.

Супярэчнасьці ў лягеры германскага фашызму

Нацыяналісты патрабуюць роўнапраўя

БЭРЛІН, 4 (Белта). Кіраўніцтвам нацыянальнай партыі пасьля дакладу лідэра партыі міністра народнай гаспадаркі **Гугенбэрга,** прынята рэзалюцыя, якая патрабуе для нацыяналістаў поўнага роўнапраўя ва ўсіх галінах палітычнага і гаспадарчага жыцьця.

Далей рэзалюцыя патрабуе, каб «як мага хутчэй быў адноўлен цьвёрды прававы парадак» і каб гаспадарка не падпадала «экспэрымэнтам і самаўпраўству».

Рэзалюцыя асабліва падкрэсьлівае, што аб'яднаньне кіраўніцтва гаспадарчымі міністэрствамі, якое ажыцьцяўляецца Гугенбэргам, зьяўляецца «гарантыяй манапалістаў кіраўніцтва германскаю гаспадаркаю». Рэзалюцыя падкрэсьлівае нацыяналістычныя і манархічныя мэты партыі нацыяналістаў.

Капітуляцыя жоўтых прафсаюзаў перад Гітлерам

БЭРЛІН, 4 (Белта). Як паведамляе афіцыёз нацыянал-сацыялістаў «Нацыянал-сацыялістышэ партэй-карэспандэнс», каталіцкія і гіршдункероўскія прафсаюзы, а таксама рад іншых жоўтых і буржуазных прафсаюзных арганізацый заявілі, што безагаворачна падпачываюцца кіраўніцтву Гітлера і ўказаньням камітэту па «уніфікацыі» прафруху.

„Эмбарго—крок да вайны супроць СССР"

Лёндан, 4 (Белта). Міжпынабудаўнікі **Спрынгбэрна** (Глазко) прынялі рэзалюцыю, у якой указваюць, што абвяшчэньне эмбарго зьяўляецца крокам да вайны супроць СССР. Яны абавязуюцца прапідзейнічаць перавозу ваенных матар'ялаў і войск, якія могуць быць скарыстаны для вайны з СССР, і заклікаюць акруговы камітэт і выканком машынабудаўнічых рабочых далучыцца да гэтай рэзалюцыі.

Рэзалюцыі, якія патрабуюць адмены эмбарго, прыняты **Лівэрпульскім** прафсаветам, які прадстаўляе звыш 100 тысяч рабочых, і чыгуначнікамі **Н'ю-Кэстлю.**

***

Лёндан, 4 (Белта). Зьезд шатландзкіх прафсаюзаў прыняў рэзалюцыю пратэсту супроць палітыкі ангельскага ўраду ў адносінах СССР. Зьезд,—гаворыцца ў рэзалюцыі,—рашуча пярэчыць супроць скасаваньня англа-савецкага гандлёвага дагавора і антысавецкай кампаніі, якая вядзецца друкам і натхняецца ўрадам. Зьезд прыняў рэзалюцыю пратэсту супроць пры гаворсраў **мірыцкім** вязьням і абраў дэлегацыю на зьезд прафсаюзаў **Ірляндыі.** Сярод абраных—член кампартыі **Стэфэнсон.**

ВЕНА, 3 (Белта). Камэнтуючы разгром германскіх рэфармісцкіх прафсаюзаў, «Ротэ Фане» піша, што фашызмыя іх толькі завяршае будынак, які будавалі рэфармісцкія лідэры, на-капітан Лейпарта.

ПРЫЕМ САВЕЦКАЙ ГАНДЛЕВАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ НАМЕСЬНІКАМ ПОЛЬСКАГА ПРЭМ'ЕРА

ВАРШАВА, 4 (Белта). Учора савецкая гандлёвая дэлегацыя была прынята намесьнікам прэм'ера **Ляхніцкім.** Затым дэлегацыя была запрошана на ваенны парад, які адбыўся ў сувязі са сьвятам 3 мая. Увечары адбыўся прыём для членаў гандлёвай дэлегацыі і прадстаўнікоў польскіх гандлёвых колаў у паўнамоцным прадстаўніцтве СССР. Арткамітэт па прыёме дэлегацыі паладзіў банкет у купецкім клюбо. Учора з 3 на 4 мая члены дэлегацыі на запрашэньні польскай гандлёва-прамысловай палаты зрабілі паездку па Польшчы па маршруце Гдыня-Познань-Катавіцы-Кракаў для азнаямленьня з прамысловымі цэнтрамі Польшчы.

Дэлегацыю суправаджаў Клярнэр.

Заміраньне цяжкай прамысловасьці Польшчы

ВАРШАВА, 3. (Белта). Газэта «Роботнік» паведамляе, што ў Польшчы здабыча жалеза ўпала ў 1932 г. у параўнаньні з 1931 годам на 50 проц. у 1928 годзе ў цяжкай прамысловасьці Польшчы было занята 52.753 рабочых, а ў канцы 1932 г.—толькі 26.573. Сума выплачанай зарплаты скарацілася на 44,9 проц. у параўнаньні з папярэднім годам. Спажываньне жалеза на душу насельніцтва скарацілася з 35,9 кгр. у 1928 г. да 6 кгр у 1932 г. На вагонапаравозабудаўнічых заводах лік занятых рабочых зьменшыўся з 10.495 у 1928 г. да 5.467 у першым квартале 1933 г.

ПА ШПАЛЬТАХ ГАЗЭТ СССР

Лёдавы паход Ленінград—Уладывасток

У палоні пад кіраўніцтвам старшыні камітэту вялікага Паўночнага шляху тав. Шмідта адбудзецца другі лёдавы паход Ленінград-Уладывасток вялікім Паўночным шляхам. Задача экспэдыцыі паўтарыць рэйс «Сібіракова», прайсьці ў адну навігацыю ўвесь шлях («ТИХООКЕАНСКАЯ ЗВЕЗДА»).

Першы Савецкі фрэз-экскаватар

Канструктары Харкаўскага заводу «Серп і молат» Сініцын, Тулупій і Камповіц выпусьцілі першы савецкі фрэз-экскаватар. Новая машына зроблена цалкам з савецкіх матар'ялаў і павінна адыграць вялікую ролю ў сельскай гаспадарцы, асабліва на цукрова-бураковых плянтацыях. Фрэз-экскаватар дае магчымасьць мэханізаваць капаньне каналаў для барацьбы са шкоднікамі. Да канца году будзе выпушчана 450 машын. («КОМУНІСТ»).

Новы халадзільнік у Баку

У Баку пачалася пабудова новага халадзільніка. Халадзільнік разьлічан на хаваньне 3.000 тон мясапрадуктаў. Кошт будаўніцтва 4 млн. рублёў. («БАКИНСКИЙ РАБОЧИЙ»).

Разьвядзеньне ціха-акіянскага краба ў Паўночным краі

Ціха-акіянскі краб зьяўляецца асновай кансэрвовай прамысловасьці Далёкага Ўсходу. Зараз пачаліся вопыты акліматызацыі ціха-акіянскага крабу ў Паўночным краі. Партыя крабавай ікры выжыла і разьвілася ў спэцыяльным акварыуме ў Мурманску. Гэта адкрывае вялікія пэрспэктывы перад кансэрвова-рыбнай прамысловасьцю Паўночнага краю. («ПРАВДА СЕВЕРА»).

Ташкент—зялёны горад

Ташкент—горад каменьня і пылу—ператвараецца ў горад садоў. За апошнія гады насаджаны тысячы дрэваў розных відаў. З самых аддаленых мясцовасьцяй прывезены новыя расьліны (агавы, камэліі, апэльсіны, лімоны). Распачалося асфальтаваньне вуліц. Мэханізуецца паліўка насаджэньняў пры дапамозе электраматораў («ПРАВДА ВОСТОКА»).

Тара з чароту

У станіцы Старомінскай (Паўночны Каўказ) пушчан першы ў Саюзе вопытны завод па выпрацоўцы тары з чароту. Прадукцыйнасьць заводу —2 млн. адзінак у год («МОЛОТ»).

Аўтаматычна пішучая радыё-апаратура

Майстэрні «Закрадыёстрою» ў Тыфлісе асвоілі выраб аўтаматычнай радыёапаратуры. Калегія НКСувязі прызнала якасьць выробленых апаратаў вельмі добрай—яны ня ўступаюць імпартнай прадукцыі. Устаноўка аўтаматычнай пішучай апаратуры значна паскарае перадачу і прыёмку тэлеграм. Замест 20 слоў у мінуту пры ручной перадачы, бу дзе перадавацца 200 і больш слоў.

Майстэрні атрымалі заказ на 200 камплектаў апаратуры для патрэб радыёсувязі СССР. («ЗАРЯ ВОСТОКА»).

MADE IN USSR

ВЫРАБЛЕНА У СССР



Рыбінскі завод імя т. Ягоды зрабіў першы вопыт вытворчасьці савецкай ратацыі. (Хуткадрукарская машына).

1-ае МАЯ У МЕНСКУ

Справаздача аб рабоце Беларускай Акадэміі Навук у ЦВК СССР

МАСКВА. (Белта). Прэзыдыум ЦВК СССР заслухаў 27 красавіка даклад аб рабоце Ўсесаюзнай, Украінскай і Беларускай Акадэмій навук. Даклад аб рабоце Ўсесаюзнай акадэміі зрабіў неадменны сакратар акадэміі — акадэмік В. П. ВОЛГІН. Аб рабоце Украінскай акадэміі зрабіў даклад прэзыдэнт акадэміі — акадэмік А. А. БАГАМОЛЕЦ. З дакладам аб рабоце Беларускай акадэміі навук выступіў прэзыдэнт акадэміі — акадэмік П. О. ГОРЫН.

Беларуская акадэмія навук ужо налічвае 17 акадэмікаў, 53 вучоных спэцыялістаў, 43 старшых навуковых супрацоўнікаў, 59 навуковых супрацоўнікаў, 129 здольных навукова-тэхнічных работнікаў і 272-х асьпірантаў. Акадэмія мае 15 навукова-дасьледчых інстытутаў.

Галоўная ўвага акадэміі ў 1932 годзе была сканцэнтравана на адшуканьні сырцовых рэсурсаў і карысных выкапняў у Беларусі, на вывучэньні глеб і мерапрыемстваў, спрыяючых павышэньню ўраджайнасьці, на барацьбе са шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы і хвалёлагадоўлі, вывучэньні хвароб буль бы, вывучэньні прамысловай фаўны, распрацоўцы тэрміналёгіі і спрашчэньня беларускага правапісу, а таксама на распрацоўцы мэтадалёгічных пытаньняў у галіне філёзофіі, эканомікі, гісторыі і літаратуры.

Зараз акадэмія працуе над праблемай Вялікага Дняпра, праводзіць біялёгічнае вывучэньне БССР, вывучэньне торфу з пункту гледжаньня скарыстаньня яго для прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, вывучае беларускія балоты ў мэтах асваеньня іх для новых сельска-гаспадарчых і тэхнічных культур.

Як Усеукраінская, так і Беларуская акадэміі навук зараз перамагаюць спадчыну контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў, якія ў мінулым мелі значны ўплыў на характар работы акадэміі.

За апошні час Беларуская акадэмія навук правяла вялікую работу ў галіне марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі і барацьбы з ідэалёгіяй вялікадзяржаўнікаў і нацыянал-дэмакратаў у гісторыі Беларусі, этнаграфіі, мовазнаўстве, літаратуры і мастацтве, эканамічнай геаграфіі, савецкім будаўніцтве і краязнаўстве.

Беларуская акадэмія канцэнтрує ў сабе навуковую прапрацоўку пытаньняў будаўніцтва пралетарскай культуры нацменшасьцяй БССР (яўрэйскай, польскай, літоўскай, латыскай).

Разгортваньню работы акадэміі некаторым чынам перашкаджаюць павольныя тэмпы будаўніцтва новага будынку акадэміі.

Па дакладах трох акадэмій на пасяджэньні прэзыдыуму ЦВК СССР выступілі т. т. КАЛІНІН, КІСЯЛЁЎ, ЧУЦКАЕЎ, ГОЛЬДМАН, АКАДЭМІК ПАЛЛАДЗІН І ПАКРОЎСКІ (НАРКАМАСЬВЕТЫ УССР).

Прэзыдыум ЦВК ухваліў прыняць даклады да ведама, а для распрацоўкі рэзалюцый па дакладах выбраў камісію пад старшынствам тав. ЧУЦКАЕВА.

Падрыхтоўка да давыбараў акадэмікаў

Пачалася падрыхтоўчая работа па давыбарах новых акадэмікаў у Акадэмію Навук Беларусі. Цэнтральнае бюро сэкцыі навуковых работнікаў разам з гарбюро, абгаварыўшы пытаньне аб давыбарах, высунула кандыдатамі ў акадэмікі т. т. ДОМБАЛЯ І ГАЎСМАНА.

Фізыка-тэхналёгічны інстытут высунуў кандыдатам у акадэмікі тав. ІОФЭ.

Інстытут хэміі высунуў кандыдатуру тав. КУРНАКОВА ў члены-карэспандэнты Акадэміі Навук Беларусі.

АБ АСЛАБАНЕНЬНІ тав. РАЧЫЦКАГА Ц. М. АД АБАВЯЗКАЎ НАРОДНАГА КАМІСАРА ЗЯМЛЯРОБСТВА БССР

Пастанова прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

У сувязі з пераходам тав. **Рачыцкага Піліпа Мікалаевіча** на іншую работу аслабаніць яго ад абавязкаў народнага камісара зямляробства БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

АБ НАЗНАЧЭНЬНІ тав. БЭНЗЭКА К. Ф. НАРОДНЫМ КАМІСАРАМ ЗЯМЛЯРОБСТВА БССР

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

Назначыць тав. **Бэнзэка Казіміра Францавіча** народным камісарам зямляробства БССР, пакінуўшы яго намесьнікам старшыні Савету Народных Камісараў БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

3 мая 1933 г.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Сёньня, 5 мая 1933 г.

склікае

НАРАДУ з пісьменьнікамі і крытыкамі

па пытаньнях удзелу пісьменьнікаў у пасеўнай кампаніі і канкрэтнай сувязі паміж рэдакцыяй і пісьменьнікамі.

Запрашаюцца на нараду пісьменьнікі, якія выяжджаюць на раёны для ўдзелу ў пасеўнай кампаніі.

Нарада пачнецца роўна а сёмай гадзіне ў памяшканьні рэдакцыі „Зьвязды", 3-ці паверх. пакой 4.

Рэдакцыя газэты „ЗЬВЯЗДА".

АНГЕЛЬСКІ ДРУК АБ ПЕРШАМАЙСКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ У МАСКВЕ

Лёндансні ўласны карэспандэнт «Правды» тэлеграфуе: «Увесь лёндансні друк вымушан канстатаваць грандыёзную першамайскую дэманстрацыю ў Маскве і, у прыватнасьці, магутнасьць Чырвонай арміі, якая выявілася на першамайскім парадзе. Надрукаваная амаль ва ўсіх газэтах карэспандэнцыя агенцтва «Рэйтэр» гаворыць: «Гіганцкі ваенны парад з тысячай ашчаніцкіх гарматамі танкаў і гудзяўшымі над галавой 350 самалётамі—так Саветы сьвяткавалі першага мая. Больш за 50 тыс. салдат і маракоў Чырвонай арміі і флёту прайшлі каля маўзалею Леніна на Красным плацы. Сьледам за вайсковымі больш за 1 млн. рабочых і іх дзяцей, якія прадстаўлялі адну трэцюю частку насельніцтва Масквы, уліліся на пляц праз тры ўваходы і праходзілі міма маўзалею Леніна ў цэона злучаных фалянгах шырынёй у 200 футаў».

Карэспандэнт «Манчэстэр Гардыян» піша: «Сёньня Масква прадэманстравала найбольш грандыёзную народную дэманстрацыю з часу рэвалюцыі»

Апісаўшы парад, карэспандэнт гаворыць далей: «Калі савецкі ўрад меў намер зрабіць уражаньне на замежных ваенных аташэ, гэта яму бясспрэчна ўдалося. Дыплёматы, якія памятаюць многія парады, зышліся на тым, што сёньняшняя дэманстрацыя перавысіла ўсе папярэднія. Нота абароны краіны, прагучаўшая ў ваенным дэманстрацыі, была падкрэслена ў прамовах, лёзунгах і перадавых артыкулах у прэсе па ўсім Савецкім саюзе».

Перадавы артыкул «Таймс» панура канстатуе: «У камуністычнай Маскве быў пратэсаючы парад ваенных сіл. Больш за 50 тысяч войск прайшло каля маўзалею Леніна ў той час, калі сотні танкаў грукацелі ў калёнах і безьліч самалётаў кружылі ў паветры».

Карэспандэнт «Дэйлі Тэлеграф», апісваючы парад, заўважвае: «Ваенны парад зрабіў страшэннае ўражаньне ў адносінах посьпехаў, дасягнутых у мэханізацыі Чырвонай арміі, якая стала грозай ударнай сілай».

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ-1)

СЁНЬНЯ

МОСТ

Пачатак у 8 гадз. веч.

Чырвоная Зорка — Каса адкрыта ад 1 гадз. — Замежны мастацкі фільм **Востраў крушэньняў** драма ў 6 частках

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр — Каса з 1 г. дня. — **ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ ЗЬМЕНА РАСЬЦЕ** ВЕЧЭРНІЯ СЭАНСЫ **РУБІКОН**

Інтэрнацыянал — Каса—ад 4 г. дня — Мастацкі фільм **ПРАСТЫ ВЫПАДАК**

„Кіно Пралетары" — Новы замежны фільм **МАГАРАДЖА**

„СПАРТАК" — Каса—ад 2 г. 30 м. — З 4 мая мастацкі фільм **НАХАНЬНЕ ПАД ВЯЗАМІ** (жанчына з кірмашу) драма ў 6 частках

ЗАХОДНЯЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ „ВСЕПРОМУТИЛИЗАЦИИ"

— даводзіць да ведама —

ўсіх аб'яднаньняў, трэстаў, будаўніцтваў прадпрыемстваў і гасп. арганізацый, што на падставе пастановы ўраду ад 23-2-33 г. **аддзяленьне набывае ўсе лішнія і няліквідныя матэрыялы і матар'ялы** тэхнічнага снабжэньня з неадкладнай аплатай іх кошту.

У мэтах ажыцьцяўлення выкананьня гэтай пастановы ўраду, усім фондатрымальнікам усе прапановы на рэалізаванасьць матэрыялы і матар'ялы тэхнічнага снабжэньня трэба накіроўваць заходняму аддзяленьню „Всепромутилизации".

Прапановы павінны заключаць наступныя весткі: а) № на парадку, б) № ярлыка прадпрыемства (бірка на тавары), в) дакладная назва матар'ялу, г) розьмер д) характарыстыка тэхнічнага стану і процант годнасьці, е) адзінка вымярэньня, ж) колькасьць матар'ялу, з) прамысловая цана за адзінку, і) сума.

Прапануемыя тавары будуць ацэньваецца і аплачваецца ў парадку, устаноўленым Дзяржбанкам СССР.

Адрас: г. Менск 1-к Дайкабродзкая, д. № 3.

Дзяржаўнае акцыянэрнае Таварыства **„ІНТУРЫСТ"**

ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО ЯНО БЭРЭ НА СЯБЕ СПРАВУ **АФАРМЛЕНЬНЯ ДАКУМАНТАЎ ДЛЯ ВЫЕЗДУ З СССР ЗАГРАНІЦУ** для тых, хто жадае на сталае жыхарства выехаць заграніцу.

Усе выдаткі па афармленьню дакумантаў і абслугоўваньню пасажыраў *„ІНТУРЫСТ"* прымае у замежнай валюце.

Цана пашпарту: для працоўных **500 руб.,** для грамадзян іншых катэгорый — **1000 р.**

Усе даведкі аб высьадзе на сталае жыхарства заграніцу можна атрымаць **у канторах і аддзяленьнях „Інтурыст"** па ніжэйпаказаных адрасох або непасрэдна ў праўленьні **„Інтурыст"**

ПА АДРАСЕ:

гор. Москва, ул. Горького, 11, гостиница „Национал", пассажирское управление „Интуриста".

АДРАСЫ аддзяленьняў „Інтурыста" ў наступных гарадох:

ЛЕНИНГРАД—ул. Ласаля, дом 1, гостиница „Европа".
Н. НОВГОРОД—Советская пл., гостиница „Россия".
СТАЛИНГРАД—ул. Гоголевская, д. 5, гостиница „Люкс".
СЕВАСТОПОЛЬ—ул. К. Маркса, д. 32.
ЯЛТА—Ленинская ул., гостиница „Ленинград".
РОСТОВ-ДОН—ул. Энгельса, д. 55.
ХАРЬКОВ—Пл. Тевелева, д. 30.
КИЕВ—ул. Карла Маркса № 5, гостиница „Континенталь".
ОДЕССА—Пушкинская, дом 15, гостиница Черноморская.
МИНСК—Комсомольская, 20.
ВЛАДИВОСТОК—Пр. 25 Октября—гостиница „Золотой Рог"
ТИФЛИС—ул. Руставели, гостиница „Ориент".
БАКУ—ул. Малыгина, гостиница „Новая Европа".
БАТУМ—Кутайская ул. № 3, гостиница „Интернационал".

Згодна пастановы СНК БССР ад 7-IV-г. г. за № 57,

Белкантора „ЗАГОТПТУШКА"

ЛІКВІДУЕЦЦА.

Усе арганізацыі, якія маюць прэтэнзіі да канторы

„ЗАГОТПТУШКА",

павінны гэткія прад'явіць ліквідкому

да 10-V—33 г.,

пасьля якога тэрміну прэтэнзіі прымацца **НЯ БУДУЦЬ.**

ліквідком.

Украдзеную круглую пячатку фабкому „Чырвоны тэкстыльшчык" лічыць несапраўднай

За неаплату пазыкі ў тэрмін

прадаюцца

наступныя матар'ялы, належачыя арцелі **„ЧЫРВОНЫ МЭБЕЛЬШЧЫК":**

1. **Цэглабудаўнічая—20.000 штук**
2. **Бярвенны будаўнічае розная—таўшыні 80 к.-м.**

Бабруйскае аддзяленьне Дзяржбанку.

Беларускі дзяржаўны завочны мэдінстытут

АБВЯШЧАЕ, што **прыём заяў** на 1-шы курс **працягнут да 15 мая.**

Дакументы накіроўваць: Менск, Дом Ураду, НК Яхаў Здароўя, завочнаму мэдінстытуту.

Дырэкцыя.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ

ЛІТАРАТУРА **ДА ДНЯ ПРАЛЕТАРСКАГА ДРУКУ**

(5-га мая 1933 г.).

ВЫШЛІ З ДРУКУ

І ёсьць у продажы:

Крупская Н. К. Ленін—рэдактар і арганізатар партыйнага друку 1932 г. Ц. 20 кап.

Драгуноў, Парцяннін і Прамкоў (работнікі катэдры друку УсеКПК імя „Правды"). Аб пралетарскім друку. Зборнік. (Артыкулы. Прамовы. Пастановы) 1933 г. Ц. 1 р. 30 к., пер. 30 к.

Асновы марксыцка-ленінскага вучэньня аб друку, вып. I (ВІМЗО—Зав. Кам. Ун-т) 1932 г. Ц. 1 р.

Постышаў П.—Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, веснавая сяўба і **задачы рабселькораў.** (Даклад на 1 абласным зьезьдзе рабселькораў Харкаўшчыны 16 сакавіка 1933 г.) 1933 г. Ц. 25 к.

Будзінскі С. і Курціх А.—Друк—самая вострая, самая моцная зброя партыі. (Даклады зробленыя 10-11 ліпеня 1931 г. на II Усебеларускім зьезьдзе рабселькораў). 1932 г. Ц. 95 к.

Джэлюк А. і Сімховіч Р.—Дакада ўдарнай работы. (Габінэт друку КУБ імя Леніна) 1932 г. Ц. 50 к.

Па-новаму працаваць.—Пастановы ўсесаюзнай нарады пры „Правде" па пытаньнях рабселькораўскага руху (люты 1931 г.) і рэзалюцыі II Усебеларускага зьезду рабселькораў (11-14 ліпеня 1931 г.) 1932 г. Ц. 1 р. пер. 20 к.

Ударнікам бальшавіцкага друку. Важнейшыя пастановы па пытаньнях рабселькораўскага руху і ўдарніцтва ў друку. 1932 г. Ц. 80 к. (у калянкоры).

Гелер І.—Памятка ваенкору на манэўрах. 1932 г. Ц. 10 к

Мірын В. М.—„Трывога". Вопыт газэты Асобай чырвонасьцяжнай Далёкаўсходняй арміі. 1932 г. Ц. 1 р. 50 к.

ПАТРАБУЙЦЕ ва усіх кнігарнях (ДВБ, БАКТ'у і РСС) і ў бібліятэках!

Ячэйка КП(б)Б, дырэкцыя, мясцком і супрацоўнікі Менскага аўта-дарожнага тэхнікуму выказваюць глыбокае спачуваньне выкладчыку тав. **САМАХВАЛАВУ С. Т.** з прычыны сьмерці яго **ЖОНКІ.**

Вынас цела з дому—Правіянская, 41 сёньня 5 мая, у 6 гадз. вечара.

Сям'я і знаёмыя паведамляюць аб сьмерці **Язэпа Флёрыянава ТУРКЕВІЧА.**

Палітэмігранта з Польшчы. Пахаваньне адбудзецца сёньня в 7 гадз. веч. Вынас цела з кватэры па Унівэрсытэцкай, вул. 4 кв. 6.

Інстытут масавага завочнага навучаньня партактыву пры ЦК КП(б)Б

РАСКЛАД

РАДЫЁ-ПЕРАДАЧ НА МАЙ 1933 г.

(Перадачы інстытуту адбываюцца праз Менскую радыёстанцыю РВ—10, а 7-й гадзіне ўвечары штодзенна апрача 6, 12, 18, 24 і 30 чысла)

ІМЗО пры ЦК КП(б)Б прадаўжае ў маі перадачу на радыё для шырокага партыйнага, камсамольскага і беспартыйнага актыву гораду, саўгасаў, калгасаў і МТС 1) вучэбных лекцый прыстасована к праграмам сыстэмы завочнай партвучобы; 2) эпізодычных цыклаў, у тым ліку лекцый па пытаньнях сацыялістычн